УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

УДК 94:[352.075:63](476)"1861/1914"

ТАЛМАЧОВА
Святлана Аляксандраўна

# МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ РАСІЙСКАГА ЎРАДА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1861–1914 гг.)

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2023

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**Навуковы кансультант –** **Жытко Анатолій Паўлавіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**Афіцыйныя апаненты:** **Каханоўскі Аляксандр Генадзьевіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
дэкан гістарычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Палятаева Наталля Іванаўна,**
доктар гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры эканамічнай гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»;

**Ярмусік Эдмунд Станіслававіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы».

**Апаніруючая арганізацыя:** дзяржаўная навуковая ўстанова
«Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Абарона адбудзецца 17 мая 2023 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, ауд. 482, тэл.: 327-82-96, e-mail: tolmachova.sv@yandex.ru.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

Аўтарэферат разасланы 17 красавіка 2023 г.

В.а. вучонага сакратара
савета па абароне дысертацый І.В.Варывончык

# УВОДЗІНЫ

Даследаванне аграрных праблем у рэчышчы іх уплыву на сацыяльна-эканамічнае і палітычнае жыццё насельніцтва Расійскай імперыі адносіцца да найбольш актуальных у сучаснай гістарычнай навуцы. У беларускай гістарыяграфіі наглядаецца пераасэнсаванне традыцыйных поглядаў на сацыяльна-эканамічныя працэсы, якія працякалі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і, у прыватнасці, у аграрным сектары эканомікі. У гэты час пераважная большасць падатнага насельніцтва была сканцэнтравана менавіта ў сельскай мясцовасці, таму расійскі ўрад надаваў важнае значэнне тым органам мясцовага кіравання, якія непасрэдна ажыццяўлялі рэалізацыю аграрных мерапрыемстваў. Гэта істотным чынам уплывала на мадэрнізацыю гаспадарчых адносін.

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі ўвагу даследчыкаў прыцягвала, галоўным чынам, пытанне нарматыўна-прававога забеспячэння функцыянавання дзяржаўных установ. У савецкай гістарычнай навуцы вектар даследаванняў факусаваўся на аграрнай праблематыцы, якая ўплывала на апазіцыйныя настроі і ўздым сялянскага руху. Разам з тым, вывучэнню пытанняў арганізацыі і дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі асноўных мерапрыемстваў урадавай аграрнай палітыкі належнай увагі не надавалася, што *актуалізуе прадмет дысертацыйнага даследавання.*

Установы па сялянскіх справах былі важнай складовай сістэмы мясцовых органаў кіравання, і менавіта яны адказвалі за рэалізацыю і вынікі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Нягледзячы на значную цікавасць навукоўцаў да аграрнага пытання, гістарыяграфічная рэфлексія праблемы дазваляе сцвярджаць, што ў гістарычнай навуцы назапашаны багаты вопыт вывучэння аграрных рэформ у цэлым ці асобных кірункаў дзейнасці традыцыйных органаў кіравання па іх рэалізацыі. *Актуальнасць, навізна прадстаўленнага даледавання* абумоўлена і тым, што распрацоўка аграрнай гісторыі немагчыма без раскрыцця механізму ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў, які тычыўся спецыяльна створаных мясцовых органаў кіравання, што дзейнічалі з 1861 па 1914 г. Вывучэнне прычын арганізацыі гэтых установ, рэфармавання структуры, функцый, асаблівасцей фарміравання штатнага складу, вынікаў дзейнасці і назапашанага вопыту не толькі *ўзмацняе актуальнасць дысертацыі, але і адкрывае новы гістарыяграфічны напрамак у даследаваннях.*

Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання ў беларускіх губернях, якія займаліся «сялянскім пытаннем», прайшлі шэраг этапаў у сваім развіцці. Складаным, але *актуальным да гэтага часу* застаецца пытанне аб неабходнасці

перыядызацыі іх дзейнасці. Тым больш, што структура органаў мясцовага кіравання не заставалася статычнай, яна перажывала пэўныя змены, гэта ж тычыцца перыядаў і рэгіёнаў іх лакацыі. У дысертацыі ў аснову перыядызацыі пакладзены паказчыкі, якія вызначалі змест функцыянальных абавязкаў і напрамкі практычнай дзейнасці органаў мясцовага кіравання па рэалізацыі аграрных мерапрыемстваў.

*Актуальнасць дысертацыйнага даследавання* вынікае і з патрабаванняў крытычнага асэнсавання аграрнай гісторыі перыяду 1861–1914 гг. з улікам новых метадалагічных падыходаў, распрацаваных беларускімі навукоўцамі. Зыходзячы з гэтага, канцэпцыя даследавання заснавана на тым, што аграрныя пераўтварэнні ўяўлялі сабой суцэльны працэс, асабліва ў беларускіх губернях. Так, рэформа 1861 г., як і пазнейшыя, не з’яўляліся аднамомантным актам, іх рэалізацыя расцягнулася да пачатку XX ст. Складанне і зацвярджэнне ўстаўных грамат, з 1863 г. – выкупных і з 1867 г. – люстрацыйных актаў патрабавалі шмат часу і напружанай работы разнастайных органаў дзяржаўнага кіравання па ажыццяўленні ўрадавай аграрнай палітыкі. Да гэтага дастасоўваліся землеўладкаванне і перавод на выкуп уласцівых толькі заходнім губерням розных сацыяльных груп саслоўя сельскіх абывацелей. Сталыпінская рэформа з’явілася лагічным працягам рэфармавання аграрнага сектара эканомікі ў цэлым. Усе аграрныя пераўтварэнні былі цесна ўзаемазвязаны паміж сабой у гістарычным часе і прасторы. Такі падыход да вывучэння праблемы таксама *актуалізуе прадмет даследавання*, надае яму сістэмны характар.

Адзначым, што рэалізацыяй аграрных мерапрыемстваў урада ў пэўнай ступені займаліся практычна ўсе мясцовыя ўладныя структуры, пачынаючы з генерал-губернатараў і іх канцылярый і да валасных праўленняў. Гэтыя пытанні часткова знайшлі адлюстраванне ў айчыннай гістарыяграфіі. Таму неабходна было абмежаваць прадмет даследавання аналізам структуры і функцый устаноў, якія былі ўтвораны спецыяльна для ажыццяўлення аграрнай палітыкі расійскага ўрада. Дзейнасць генерал-губернатараў, губернатараў і іх канцылярый, губернскіх праўленняў, мясцовых устаноў Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, Міністэрства юстыцыі і інш. у даследаванні асвятляецца толькі ў дачыненні да функцыянавання мясцовых па сялянскіх справах устаноў.

*Сацыяльная актуальнасць тэмы даследавання* абумоўлена і тым, што з 1991 г. у Рэспубліцы Беларусь вялікая ўвага надаецца мадэрнізацыі аграрнай вытворчасці, укараненню розных форм землекарыстання і землеўладання, развіццю фермерскіх гаспадарак з дапамогай дзяржаўных інстытутаў кіравання. У сувязі з гэтым вывучэнне традыцый, назапашаных у перыяд маштабных

аграрных пераўтварэнняў, з’яўляецца актуальнай праблемай даследаванняў у беларускай гістарычнай навуцы.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Даследаванне з’яўлялася складовай часткай навуковай тэмы «Эвалюцыя сістэмы органаў дзяржаўнага кіравання ў Беларусі (1861–1917 гг.)» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20111197), якая выконвалася у межах рэалізацыі дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава». У 2016–2020 гг. работа праводзілася ў рэчышчы тэмы «Дваранства Беларусі ў сістэме сацыяльна-эканамічных адносін у краі (канец XVIII – пачатак XX ст.» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20161729) па выкананні дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства», а таксама пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў па тэме «Дваранства Беларусі ў сістэме сацыяльна-эканамічных мадэрнізацыйных працэсаў у краі (1861–1914 гг.)» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20171201).

**Мэта** даследавання заключаецца ў вызначэнні сутнасці і канцэптуальнага зместу аграрнай палітыкі расійскага ўрада, выяўленні тэндэнцый, вынікаў і асаблівасцей функцыянавання, этапаў практычнай дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

- высветліць ступень навуковай распрацаванасці праблемы і інфармацыйныя магчымасці крыніц для раскрыцця прадмета даследавання;
- выявіць і ахарактарызаваць нарматыўна-прававую базу фарміравання і дзейнасці інстытута міравых пасрэднікаў і павятовых з’ездаў міравых пасрэднікаў, раскрыць іх ролю ў працэсе прававога суправаджэння ўсталявання новых сацыяльна-эканамічных адносін у вёсцы;
- ахарактарызаваць тэндэнцыі і асаблівасці практычнай работы губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей па каардынацыі дзейнасці міравых пасрэднікаў і іх з’ездаў; зацвярджэнні праектаў размеркавання сялян па абшчынах і валасцях, а таксама ўстаўных грамат, выкупных і люстрацыйных актаў; землеўладкаванні сацыяльных груп вясковага насельніцтва, уласцівых толькі для заходніх губерняў;
- вызначыць асаблівасці функцыянавання і ролю павятовых паверачных камісій у пазямельным уладкаванні сялян і іх пераводзе на выкуп;

- абгрунтаваць сутнасць і тэндэнцыі рэарганізацыі мясцовых устаноў, раскрыць асноўныя напрамкі дзейнасці губернскіх і павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях; вызначыць іх ролю ў вырашэнні пазямельных праблем і рэгуляванні дзейнасці органаў сялянскага самакіравання;
- ахарактарызаваць кірункі практычнай дзейнасці спецыяльных органаў па пазямельным уладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў, выявіць тэндэнцыі ажыццяўлення чыншавай рэформы і ступень фінансавай падтрымкі чыншавікоў у працэсе выкупу імі зямлі;
- выявіць сутнасць і раскрыць механізм увядзення інстытута земскіх начальнікаў, прасачыць асаблівасці фарміравання яго кадравага складу у беларускіх губернях, ахарактарызаваць дзейнасць земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў як органаў адміністрацыйнай і судовай улады ў сельскай мясцовасці;
- адлюстраваць асаблівасці рэарганізацыі губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, ахарактарызаваць функцыянальныя абавязкі губернскіх прысутнасцей і іх ролю ў ажыццяўленні аграрных пераўтварэнняў у пачатку XX ст.;
- раскрыць асноўныя кірункі і механізм узаемадзеяння землеўладкавальных камісій, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў у працэсе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы ў Беларусі.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст.

**Прадмет даследавання** – мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг.

**Тэрытарыяльныя межы** ўключаюць пяць губерняў – Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Магілёўскую і Мінскую. **Храналагічныя межы** даследавання ахопліваюць перыяд з 1861 па 1914 г. Ніжняя храналагічная мяжа абумоўлена стварэннем новых мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і пачаткам іх дзейнасці па рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. Верхняя мяжа адпавядае пачатку Першай сусветнай вайны, якая стала прычынай рэарганізацыі структуры і функцый мясцовых органаў кіравання[1].

[1] У сувязі з патрабаваннямі прынцыпу гістарызму пры вывучэнні перадумоў і наступстваў гістарычных падзей і з'яў, якія тычацца прадмета даследавання, аўтарскі аналіз перасягае вызначаныя тэрытарыяльныя лакацыі і храналагічныя межы.

**Навуковая навізна**

У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы выяўлена сутнасць аграрнай палітыкі расійскага ўрада з вызначэннем і абгрунтаваннем этапаў дзейнасці мясцовых дзяржаўных па сялянскіх справах устаноў па яе рэалізацыі ў кантэксце зместу і асаблівасцей іх эвалюцыі, функцыянальных абавязкаў і напрамкаў дзейнасці на тэрыторыі Беларусі з 1861 па 1914 г.:

– даказана, што канцэптуальным зместам аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў 1861–1914 гг. з'яўлялася мадэрнізацыя сацыяльна-эканамічных адносін у аграрным сектары эканомікі. Зыходзячы з аналізу і вызначэння сутнасных зменаў, упершыню абгрунтавана перыядызацыя аграрнай палітыкі, а таксама вылучаны этапы фарміравання і функцыянавання мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі;

– выяўлены перадумовы стварэння і ступень эфектыўнасці практычнай дзейнасці спецыяльных органаў мясцовага кіравання па рэалізацыі рэформы 1861 г.: міравых пасрэднікаў, іх павятовых з'ездаў, губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, павятовых паверачных камісій. Даказана, што гэтыя органы адыгралі вызначальную ролю ў працэсе прававога суправаджэння і ўсталявання новых сацыяльна-эканамічных адносін у вёсцы;

– упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі выяўлены прычыны рэарганізацыі сістэмы мясцовых па сялянскіх справах устаноў паводле закону ад 27 чэрвеня 1874 г., адтэрміноўкі яго рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі, ахарактарызавана дзейнасць губернскіх і павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у 70–90-я гг. XIX ст;

– высветлены перадумовы стварэння і вынікі дзейнасці спецыяльных органаў кіравання па пазямельным уладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў – павятовых па чыншавых справах прысутнасцей, раскрыты прычыны замаруджвання правядзення чыншавай рэформы і нежадання ўрада фінансава падтрымліваць чыншавікоў у працэсе выкупу імі зямлі;

– устаноўлены прычыны адтэрміноўкі ўвядзення інстытута земскіх начальнікаў, асаблівасці фарміравання іх кадравага складу у беларускіх губернях, ахарактарызавана дзейнасць земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў як органаў адміністрацыйнай і судовай улады ў сельскай мясцовасці, а таксама роля губернскіх прысутнасцей у вырашэнні аграрных праблем;

– упершыню ў гістарыяграфіі на аснове сістэмнага аналізу вызначаны асноўныя кірункі і механізм узаемадзеяння землеўладкавальных камісій, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў у працэсе

рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы і раскрыта ступень яе выніковасці на тэрыторыі Беларусі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Канцэптуальным зместам аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў 1861–1914 гг. з'яўлялася мадэрнізацыя сацыяльна-эканамічных адносін у аграрным сектары эканомікі. У гэтым гістарычным працэсе выяўлены два этапы. Першы ахапіў люты 1861 – кастрычнік 1906 г. На гэтым этапе аб'ектам урадавай палітыкі выступала сялянская абшчына, з якою былі звязаны асноўныя аграрныя пераўтварэнні. У губернях і паветах дзейнічалі спецыяльна створаныя органы дзяржаўнага кіравання (1861–1878 гг. – інстытут міравых пасрэднікаў, іх павятовыя з'езды, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў 1861–1903 гг. – у Віленскай і Гродзенскай губернях; 1863–1867 гг. – паверачныя камісіі ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і інфляндскіх паветах Віцебскай губерняў; 1878–1901 гг. – павятовыя і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях; 1886–1917 гг. – павятовыя па чыншавых справах прысутнасці ва ўсіх беларускіх губернях; 1901–1917 гг. – інстытут земскіх начальнікаў і іх з'езды, губернскія прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў 1903–1917 гг. – у Віленскай і Гродзенскай губернях).

Другі этап прыпадае на лістапад 1906–1914 гг., аснову якога складала сталыпінская аграрная рэформа. На гэтым этапе аб'ектам аграрнай палітыкі ўрада з'яўляўся селянін як прыватная юрыдычная асоба, а ўсе мерапрыемствы па яе рэалізацыі непасрэдна ажыццяўлялі павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі, земскія начальнікі, іх павятовыя з'езды і губернскія прысутнасці.

2. На першым этапе дзеля практычнай рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. была створана нарматыўна-прававая база, у адпаведнасці з якою быў заснаваны спецыяльны орган – інстытут міравых пасрэднікаў, які не адносіўся да традыцыйнай структуры ўлады і кіравання. У мэтах прававога суправаджэння ўсталявання новых сацыяльна-эканамічных адносін кадравы склад гэтай інстытуцыі быў надзелены пэўнай прававой самастойнасцю. Міравыя пасрэднікі валодалі шырокім колам адміністрацыйных і судовых (у беларускіх губернях да 1872 г.) паўнамоцтваў. Галоўным функцыянальным абавязкам пасрэднікаў было прававое абслугоўванне складання ўстаўных грамат. З пераводам сялян Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і чатырох інфляндскіх паветаў Віцебскай губерняў з 1 мая 1863 г. на абавязковы выкуп міравыя пасрэднікі разам з членамі паверачных камісій зацвярджалі выкупныя акты. Адметнай асаблівасцю гэтага працэсу было тое, што ў

беларускіх паветах Віцебскай і Магілёўскай губерняў гэтыя акты зацвярджаліся з'ездамі міравых пасрэднікаў.

Важную сацыяльную функцыю ў працэсе рэалізацыі рэформы адыгрывалі з'езды міравых пасрэднікаў, якія з'яўляліся ніжэйшай апеляцыйнай інстанцыяй на рашэнні пасрэднікаў, сельскіх і валасных сходаў і іх праўленняў. У мэтах забеспячэння інтарэсаў землеўладальнікаў кадравы склад міравых пасрэднікаў да 1864 г. у асноўным фарміраваўся з мясцовых памесных дваран рымска-каталіцкага веравызнання. Іх дачыненне ў любой форме да падзей паўстання 1863–1864 гг. абумовіла страту даверу і абнаўленне складу міравых пасрэднікаў кадрамі наменклатуры, што напраўляліся ў край з іншых губерняў. Паступовае ўсталяванне новых сацыяльна-эканамічных адносін, а таксама пачатак рэалізацыі судовай рэформы паклалі пачатак працэсу скасавання інстытута міравых пасрэднікаў, што ў беларускіх губернях адбылося ў 1878 г. і ў 1903 г.

Пад ўплавам паўстання 1863–1864 гг. у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і чатырох паветах Віцебскай губерняў паўнамоцтвы павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў былі перададзены паверачным камісіям. Асаблівасцю гэтага працэсу стала тое, што з заканчэннем работы апошніх у 1867 г. функцыянаванне з'ездаў аднаўлялася, але іх старшыні – павятовыя прадвадзіцелі дваранства – не выбіралася, а прызначалася ўладамі. У адрозненне ад іншых, у беларускіх губернях пасада старшыні (прадвадзіцеля) з'езда аплочвалася, што надавала яму статус службовай асобы, і з гэтага часу дзейнасць з'ездаў кантралявалася органамі традыцыйнай дзяржаўнай улады.

3. Важная роля ў ходзе рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў адводзілася губернскім па сялянскіх справах прысутнасцям. Фарміраванне кадравага складу прысутнасцей знаходзілася пад кантролем урада. У сувязі з гэтым кадравы корпус прысутнасцей фарміраваўся з асоб, якія ў губернях займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады (губернатар, губернскі прадвадзіцель дваранства, кіраўнік палаты дзяржаўных маёмасцей, губернскі пракурор). Пры гэтым улічваліся і інтарэсы пануючага дваранскага саслоўя, выбарныя прадстаўнікі ад якога таксама з'яўляліся членамі прысутнасцей. Аднак пад уплывам паўстання 1863–1864 гг. яны паступова замяшчаліся асобамі з ліку ўрадавай наменклатуры, што супярэчыла заканадаўству 1861 г. і стала асаблівасцю гэтага працэсу ў беларускіх губернях.

Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці выконвалі важныя сацыяльныя функцыі, да ліку якіх адносіўся апеляцыйны нагляд, кантроль за пазямельным ўладкаваннем сельскага насельніцтва. Вердыкты губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей не падлягалі абскарджванню, аднак пад уплывам паўстання 1863–1864 гг. становішча змянілася, скаржнікі атрымалі

права падаваць пратэсты на рашэнні прысутнасці ў Сенат у касацыйным парадку, што стала адметнай асаблівасцю іх дзейнасці на тэрыторыі Беларусі.

Галоўным абавязкам прысутнасцей з’яўлялася пазямельнае ўладкаванне сельскага насельніцтва праз наданне ўстаўным граматам, выкупным і люстрацыйным актам юрыдычнай сілы. У мэтах прававога суправаджэння ўсталявання новых сацыяльна-эканамічных адносін прысутнасці ў беларускіх губернях не толькі кіравалі ўсімі справамі па землеўладкаванні памешчыцкіх і казённых сялян, але і вольных людзей, аднадворцаў, старавераў, праваслаўных арандатараў і іншых груп саслоўя сельскіх абывацелей, не ўласцівых вялікарускім губерням.

Да функцыянальных абавязкаў прысутнасцей адносілася зацвярджэнне праектаў падзелу тэрыторыі на сельскія грамады і воласці. Аднак такое адміністрацыйнае размеркаванне часам супярэчыла інтарэсам сялянства. Асаблівасцю функцыянальных абавязкаў прысутнасцей у беларускіх губернях з’яўлялася раскладка кантрыбуцыйнага збору з даходаў маёнткаў дваран-католікаў і іх нерухомай маёмасці ў гарадах і мястэчках. Дадзены збор эканамічна падрываў гаспадарку памесных дваран і дазваляў павялічваць грашовае ўтрыманне чыноўнікаў, якія былі запрошаны з іншых губерняў.

З 1869 г. на губернскія па сялянскіх справах прысутнасці была ўскладзена функцыя па правядзенні абавязковага размежавання сялянскіх надзелаў і памешчыцкіх зямель у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і інфляндскіх паветах Віцебскай губернях, што павінна было зменшыць сацыяльную напружанасць у вёсцы. Аднак недастатковае фінансаванне і недахоп землямераў не дазволілі прысутнасцям ў поўнай меры выканаць гэты абавязак.

4. Адметнай сацыяльнай з’явай аграрнай палітыкі расійскага ўрада было стварэнне павятовых паверачных камісій, асноўнай функцыяй якіх стала прававое забеспячэнне пераводу сялян Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і інфляндскіх паветаў Віцебскай губерняў на абавязковы выкуп з вызначэннем памераў сялянскіх надзелаў і выкупных плацяжоў.

На выкананне членамі камісій сваіх абавязкаў паўплывалі падзеі паўстання 1863–1864 гг., якія абумовілі карэнныя змены ў іх кадравым складзе. У камісіях памеснае дваранства рымска-каталіцкага веравызнання замянялася ўрадавымі чыноўнікамі. Аднак недастатковая кампетэнтнасць новых назначэнцаў, паспешлівасць ў арганізацыі працы, імкненне задаволіць інтарэсы сялян і пазбавіць эканамічнай вагі памесных дваран-католікаў ў далейшым негатыўна паўплывалі на сацыяльную напружанасць у беларускай вёсцы.

5. Рэфармаванне мясцовых па сялянскіх справах устаноў паводле закону ад 1874 г. заключалася ў стварэнні калегіяльных павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у 1878 г. Сутнасць яго заключалася ў неабходнасці усталяваць больш лаяльныя адносіны насельніцтва да ўрадавай палітыкі, зменшыць пратэстныя настроі у асяроддзі сялянства і аптымізаваць фінансавыя выдаткі дзяржавы. Адментнай асаблівасцю рэфармавання стала і фарміраванне штатаў павятовых і губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, у склад якіх урадам прызначаліся дадатковыя неадменныя члены.

Асаблівасцю дзейнасці губернскіх і павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у беларускіх губернях стала пашырэнне кола іх абавязкаў, што было абумоўлена рэалізацыяй законаў па пазямельным уладкаванні такіх сацыяльных груп насельніцтва, як вольныя людзі, праваслаўныя арандатары, сельскія вечныя чыншавікі, аднадворцы, стараабрадцы, адзінаверцы. Разам з тым, неадменныя члены павятовых прысутнасцей былі абмежаваны ў паўнамоцтвах, не мелі магчымасці самастойна вырашаць спрэчныя пытанні. Па гэтай прычыне новыя па сялянскіх справах установы не здолелі рэалізаваць у поўнай ступені свае функцыянальныя абавязкі, што выклікала неабходнасць удасканалення іх прававога статусу і штатнага кадравага складу.

6. Адметнай асаблівасцю аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі стала правядзенне чыншавай рэформы, якая прадугледжвала землеўладкаванне арандатараў на чыншавым праве. Аграрным заканадаўствам 1861 г. не прадугледжвалася іх пазямельнае ўладкаванне, што прывяло да масавага скасавання дагавораў на чыншавыя правы і павышэння арэнднай платы з боку землеўладальнікаў. Для рэалізацыі гэтай рэформы з 1886 г. ствараліся павятовыя па чыншавых справах прысутнасці, дзейнасць якіх супала з часам, калі ўрад імкнуўся наладзіць лаяльныя адносіны з памесным дваранствам заходніх губерняў. Разам з тым, абсалютную большасць арандатараў складала незацверджаная ў дваранскім саслоўі шляхта. Гэта адмоўна адбілася на дзейнасці павятовых па чыншавых справах прысутнасцей, якія імкнуліся зменшыць колькасць чыншавікоў, што прэтэндавалі на выкуп зямлі з урадавай фінансавай падтрымкай. У сувязі з гэтым рэалізацыя чыншавай рэформы расцягнулася на дзесяцігоддзі.

7. Імкненне ўрада мадэрнізаваць сацыяльна-эканамічныя адносіны ў аграрным сектары эканомікі напрыканцы 80-х гг. сутыкнулася з тым, што існуючыя па сялянскіх справах установы не здолелі належным чынам выконваць ускладзеныя на іх функцыянальныя абавязкі. Гэта прывяло да стварэння інстытута земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў. Дзеля

кантролю над органамі сялянскага самакіравання і ажыццяўлення аграрных мерапрыемстваў урада гэты інстытут надзяляўся шырокімі адміністрацыйнымі і судовымі паўнамоцтвамі. У адрозненне ад павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей, адміністрацыйная ўлада земскіх начальнікаў і іх з’ездаў узмацніла павятовае звяно дзяржаўнага кіравання. Разам з тым, ўвядзенне інстытута земскіх начальнікаў па правобразу міравых пасрэднікаў 1861–1863 гг. не адпавядала рэаліям часу ў сувязі з сумяшчэннем у адной асобе адміністрацыйных і судовых функцый, ліквідацыяй міравога суда ў сельскай мясцовасці, жорсткім кантролем над органамі сялянскага самакіравання, асабліва з пачаткам сталыпінскай аграрнай рэформы, якая прадугледжвала разбурэнне пазямельнай абшчыны і стварэнне слоя заможных сялян-землеўласнікаў з наданнем сялянству ўсіх юрыдычных правоў нараўне з іншымі саслоўямі.

Кадравы патэнцыял земскіх начальнікаў у Беларусі фарміраваўся пераважна са складу спадчынных дваран, якія не пражывалі ў беларускіх губернях, не выбіраліся на дваранскіх сходах, што супярэчыла заканадаўству і з’явілася асаблівасцю гэтага працэсу.

8. У выніку ажыццяўлення ўрадавай аграрнай палітыкі, мадэрнізацыі эканомікі і развіцця рынкавых адносін сацыяльная структура сельскага насельніцтва істотна змянілася. Пасля рэформы 1861 г. асноўнымі суб’ектамі гэтых адносін з’яўляліся памешчык – селянін. З развіццём капіталізму ў вёсцы склаліся новыя катэгорыі насельніцтва – прамысловая і гандлёвая буржуазія, рабочы клас, што значна ўскладняла жыццё ў правінцыі. Таму губернскія па сялянскіх справах прысутнасці сталі анахранізмам. Спатрэбіўся новы кіруючы орган, на які ўскладваліся задачы па вырашэнні праблем больш рознабаковага маштабу. Ім сталі губернскія прысутнасці. У пачатку ХХ ст. яны адыгрывалі важную ролю ў рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў, гэтым органам надаваліся шырокія паўнамоцтвы па каардынацыі і кантролю за дзейнасцю земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў. У параўнанні з губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі, асаблівасцю дзейнасці рэарганізаваных прысутнасцей стала больш дасканалае выкананне функцыянальных абавязкаў, што ў значнай ступені спрыяла вырашэнню аграрных праблем у Беларусі.

9. Сутнасцю аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў 1906–1914 гг. стала нацэленасць на рашучае наданне асобе селяніна роўных юрыдычных правоў з іншымі сацыяльнымі групамі насельніцтва, перш за ўсё ў пытанні выбару форм землеўладання, пад час рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы. У гэтым кірунку аграрныя мерапрыемствы ажыццяўлялі спецыяльна створаныя павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі. Асаблівасцю

функцыянавання губернскіх землеўладкавальных камісій ў Віленскай і Гродзенскай губернях з'явілася тое, што да іх адкрыцця ў 1911 г. абавязкі камісій выконвалі губернскія прысутнасці.

Вынікі дзейнасці землеўладкавальных камісій залежалі ад узаемадзеяння з існуючымі органамі кіравання – земскімі начальнікамі, іх павятовымі з'ездамі і губернскімі прысутнасцямі, на якія ўскладваліся абавязкі адміністрацыйнага і прававога суправаджэння выхаду сялян з абшчыны, перадачы зямлі ў асабістую прыватную ўласнасць, стварэння адрубных і хутарскіх гаспадарак, арганізацыі перасяленняў сялян у Сібір і на Далёкі Ўсход. Зладжаная работа ўсіх звёнаў мясцовых органаў кіравання па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы ў беларускіх губернях спрыяла мадэрнізацыі сацыяльна-эканамічных адносін у вёсцы.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыя з'яўляецца першым у беларускай гістарыяграфіі комплексным даследаваннем, у якім на падставе выкарыстання інфармацыі шырокага кола крыніц, большасць з якіх упершыню ўведзена ў навуковы ўжытак, а таксама вынікаў распрацовак айчынных і замежных аўтараў па заяўленай навуковай праблеме раскрыты працэс стварэння і функцыянавання спецыяльна створаных мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада і яе выніковасці на тэрыторыі Беларусі з 1861 г. па 1914 г.

У дысертацыі выяўлены структурныя элементы дзяржаўнага механізму па ажыццяўленні аграрных рэформ 1861 г. і 1866 г. – міравыя пасрэднікі, павятовыя з'езды міравых пасрэднікаў, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, паверачныя камісіі – і раскрыты вынікі іх дзейнасці ў працэсе прававога суправаджэння ўсталявання новых сацыяльна-эканамічных адносін у беларускай вёсцы.

Усебакова паказана дзейнасць рэфармаваных губернскіх і створаных павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а таксама павятовых па чыншавых справах прысутнасцей з устанаўленнем і абгрунтаваннем прычын маруднасці ажыццяўлення аграрных мерапрыемстваў, якая была абумоўлена калегіяльнасцю губернскіх і павятовых прысутнасцей, павелічэннем колькасці спраў па пазямельным уладкаванні спецыфічных толькі для заходніх губерняў сацыяльных груп саслоўя сельскіх абывацелей, імкненнем урада супрацьпаставіць землеўласнікаў і чыншавую шляхту і інш.

У дысертацыі даказана, што ўвядзенне інстытута земскіх начальнікаў па правобразу міравых пасрэднікаў 1861–1863 гг. не адпавядала рэаліям часу ў

сувязі з сумяшчэннем у адной асобе адміністрацыйных і судовых функцый, жорсткім кантролем над органамі сялянскага самакіравання, асабліва з пачаткам сталыпінскай аграрнай рэформы, якая прадугледжвала разбурэнне пазямельнай абшчыны і стварэнне слоя заможных сялян-землеўласнікаў з наданнем сялянству ўсіх юрыдычных правоў нараўне з іншымі саслоўямі.

У дысертацыі ўпершыню ахарактарызаваны кірункі ўзаемадзеяння павятовых і губернскіх землеўладкавальных камісій, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў у ходзе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы, што да гэтага часу не з'яўлялася прадметам спецыяльнага даследавання.

Упершыню у гістарычнай навуцы выяўлены асаблівасці стварэння (розначасовасць і рознапрасторавасць для беларускіх губерняў) і функцыянавання мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў і, пачынаючы з 1864 г., камплектавання іх кадравага складу пераважна чыноўнікамі з іншых рэгіёнаў імперыі, а таксама стварэння і дзейнасці не ўласцівых велікарускім губерням устаноў – паверачных камісій і павятовых па чыншавых справах прысутнасцей.

Такі шматгранны падыход да вырашэння навуковай праблемы дазволіў выйсці на новы якасны ўзровень у вырашэнні пастаўленых даследчых задач.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання прайшлі апрабацыю на 44 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях. Вынікі даследавання ўкаранены ў адукацыйны працэс. Акты ўкаранення прыкладаюцца.

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 84 публікацыях, з якіх 1 манаграфія (20,0 аўт. л.), 14 – раздзелы ў калектыўных навуковых выданнях, падрыхтаваных у сааўтарстве (19,4 аўт. л.), 21 – у выданнях, уключаных ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікаванння вынікаў дысертацыйных даследаванняў (15,9 аўт. л.), у тым ліку 2 – у замежных выданнях, уключаных у рэфератыўную базу данных Scopus і Web of Science (2,1 аўт. л.), 12 – у рэцэнзаваных зборніках навуковых артыкулаў (6,7 аўт. л.), 36 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (16,8 аўт. л.). Агульны аб'ём апублікаваных работ складае 78,8 аўт. л.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі ўключае уводзіны, агульную характарыстыку работы, 4 главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс (959 найменняў, з іх 84 аўтарскія публікацыі) і дадаткі. Аб'ём дысертацыі складае 348 старонак, з якіх

асноўны тэкст займае 229 старонак, бібліяграфічны спіс – 84, дадаткі – 35 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першай главе **«Гістарыяграфія параблемы. Крыніцы. Метадалогія і канцэпцыя даследавання»** прадстаўлены вынікі гістарыяграфічнага аналізу прац, змест якіх закранае розныя аспекты прадмета даследавання, дадзена характарыстыка крыніц, абгрунтавана метадалогія і канцэпцыя даследавання.

*У раздзеле 1.1 “Гістарыяграфія праблемы”* публікацыі па тэме дысертацыі падзелены на дарэвалюцыйныя, савецкія і працы, якія былі падрыхтаваны ў незалежных рэспубліках на постсавецкай прасторы і ў заходняй гістарыяграфіі да 2022 г. У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі галоўная ўвага даследчыкаў была засяроджана на распрацоўцы нарматыўна-прававога ўзаемадеяння паміж цэнтральнымі і мясцовымі органамі кіравання і выяўлення іх функцыянальных абавязкаў. Гэта даследаванні прававедаў І. А. Блінова, У. М. Гесена, А. Д. Градоўскага і інш.[2]

Дзейнасць мясцовых па сялянскіх справах устаноў вывучалася ў рэчышчы рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. Сучаснікі рэформы 1861 г. – У. П. Безабразаў, А. І. Кошалеў, А. В. Арапаў, М. М. Катаеў і інш. даследавалі асобныя аспекты функцыянавання мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па сялянскіх справах[3]. У большасці дарэвалюцыйных публікацый, якія тычыліся

---

[2] Блинов, И. А. Губернаторы. Историко-юридический очерк / И. А. Блинов. – СПб. : Типо-лит. К. Л. Пентковского, 1905. – 368 с.; Гессен, В. М. Вопросы местного управления : сб. ст. / В. М. Гессен. – СПб. : Юрид. кн. скл. «Право», 1904. – [2], 235, [4] с.; Градовский, А. Д. Начала русского государственного права / А. Д. Градовский, проф. Имп. С.-Петерб. ун-та // Собр. соч. : в 3 т. – СПб. : Тип. М. М. Стасюлевича, 1907–1908. – Т 1–3; Эйхельман, О. О. Обзор центральных и местных учреждений в России и устава о службе гражданской по определению от правительства / О. О. Эйхельман. – Киев : Тип. имп. ун-та Св. Владимира, 1890. – VI, 83 с. і інш.

[3] Арапов, А. В. Краткий исторический очерк крестьянского вопроса и деятельности крестьянских учреждений Витебской губернии со дня обнародования высочайшего манифеста 19-го февраля 1861 года и до наших дней : (50-летие) / сост. непрем. чл. Витеб. губ. присутствия А. В. Арапов. – Витебск : Губ. тип., 1911. – [2], 62 с.; Безобразов, В. П. Государство и общество: Управление, самоуправление и судебная власть / В. П. Безобразов. – СПб. : тип. В. Безобразова и К°, 1882. – XXVIII, 3, 737 с.; Катаев, М. М. Местные крестьянские учреждения 1861, 1874 и 1889 гг. : (Ист. очерк их образования и норм деятельности) : Ко дню пятидесятилет. годовщины освобождения крестьян от крепостной зависимости 19 февр. 1911 г. / сост. М. М. Катаев : в 3 ч. – СПб. : Зем. отд. М-ва вн. дел, 1911-1912. – 3 т.; Кошелев, А. И. О крестьянском самоуправлении и о присутствиях по крестьянским делам / А. И. Кошелев. – М. : печатня С. П. Яковлева, 1881. – 19 с.; Миловидов, А. А. Освобождение крестьян Северо-Западного края и поземельное устройство

рускіх губерняў, становўча ацэньвалася дзейнасць міравых пасрэднікаў па рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г., а ўздзеянне на сялянства ацэньвалася пазітыўна. Іншым было стаўленне да міравых пасрэднікаў першага закліку Паўночна-Заходняга краю. Іх абвінавачвалі ў неэфектыўным правядзенні пачатковага этапу рэформы[4].

З работай Каханаўскай камісіі і абмеркаваннем праектаў агульнай рэарганізацыі мясцовага кіравання ў 80-я гг. XIX ст. звязана з'яўленне шэрагу публікацый у газетах і часопісах. Гісторыкі, публіцысты, юрысты, земскія дзеячы звярнуліся да праблемы функцыянавання павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей і неабходнасці рэфармавання гэтых устаноў[5].

Рэалізацыя «Положения о земских участковых начальниках» ад 12 ліпеня 1889 г. выклікала новую хвалю публікацый, звязаных з шырокімі судова-адміністрацыйнымі паўнамоцтвамі гэтых чыноўнікаў[6]. Разам з тым, толькі ў 90-я гг. XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца выданні аб дзейнасці мясцовых органаў кіравання ў беларускіх губернях[7].

Такім чынам, у дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі, прысвечанай органам мясцовага дзяржаўнага кіравання па сялянскіх справах, вызначаны перадумовы, ход і вынікі іх рэфармавання. Пераважная большасць даследаванняў таго часу абмінае дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей і пазнейшых губернскіх прысутнасцей. Павятовыя з'езды міравых пасрэднікаў і земскіх начальнікаў таксама не прыцягвалі ўвагу навукоўцаў і публіцыстаў. Асаблівасцю дарэвалюцыйных работ была недастатковая крынічная база, а

---

их при графе М. Н. Муравьеве / А. И. Миловидов. – Вильна : типография Св.-Духов. братства, 1901. – 56 с. і інш.

4 Крестьянское дело в Северо-Западном крае // Русский вестник. – 1868. – Т. 77, [№ 9/10, сентябрь-октябрь]. – 1868. – С. 713–773; Миропольский, Д. Из Северо-Западного края / Д. Миропольский // Беседа. – 1871. – № 10. – С. 198–212 і інш.

5 Головин, К. Наше местное управление и местное представительство / К. Головин. – СПб. : тип. М. М. Стасюлевича, 1884. – [2], VIII, 158 с.; Скалон, В. Ю. Земские взгляды на реформу местного управления : Обзор земских отзывов и проектов / [Соч.] В. Ю. Скалона. – М. : товар. «Печатня С. П. Яковлева», 1884. – [8], 236 с.; Евреинов, Г. А. Заметки о местной реформе / [Соч.] Г. А. Евреинова. – СПб. : тип. Правительствующего сената, 1888. – 131 с. і інш.

6 Берендтс, Э. Н. О прошлом и настоящем русской администрации: (Записка, составленная в декекабре 1903 г.) / Э. Н. Берендтс. – СПб. : тип. М. М. Стасюлевича, 1913. – VIII, 280 с.; Гессен, В. М. Вопросы местного управления : сб. ст. / В. М. Гессен. – СПб. : Юрид. кн. скл. «Право», 1904. – [2], 235, [4] с. і інш.

7 Стефанович, К. К. О сельском и волостном управлении в Западном крае / [Соч.] К. К. Стефановича, Бобруйс. уезд. предводителя дворянства. – СПб. : тип. Глазунова, 1895. – [2], II, 97 с., 4 л. табл.; Арапов, А. В. Краткий исторический очерк крестьянского вопроса и деятельности крестьянских учреждений Витебской губернии со дня обнародования высочайшего манифеста 19-го февраля 1861 года и до наших дней : (50-летие) / сост. непрем. чл. Витеб. губ. присутствия А. В. Арапов. – Витебск : Губ. тип., 1911. – [2], 62 с. і інш.

большасць выданняў была падрыхтавана не прафесійнымі гісторыкамі. У значнай ступені яны носяць публіцыстычны характар. Але, дзякуючы гэтым публікацыям, быў назапашаны эмпірычны матэрыял, які дае падставы для яго аналізу.

У гістарычных работах савецкага перыяду дзейнасць органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі ў 1861–1914 гг. не стала прадметам спецыяльнага вывучэння. Гэта звязана з тым, што ўжо да 30-х гг. XX ст. сфарміраваўся партыйна-класавы падыход у вывучэнні гісторыі парэформеннай Расіі. Пераважаў тэзіс аб тым, што мясцовыя па сялянскіх справах установы былі антынароднымі. У прыватнасці, У. І. Ленін ахарактарызаваў дзейнасць міравых пасрэднікаў як імкненне да «объегоривания крестьян» пры іх пазямельным уладкаванні[8]. Такі погляд стаў пануючым у савецкай гістарыяграфіі.

Даследчыкі аграрнай рэформы 1861 г. М. М. Дружынін і П. А. Зайанчкоўскі крытычна ацанілі работу службовых па сялянскіх справах асоб, падкрэслівалі саслоўны характар інстытута міравых пасрэднікаў і ўказалі на шматлікія парушэнні з іх боку пры зацвярджэнні ўстаўных грамат[9]. В. Р. Чарнуха разгледзела інстытут міравых пасрэднікаў як складовую частку сістэмы мясцовага кіравання Расійскай імперыі [10]. Н. Ф. Усцьянцава адзначыла імкненне міравых пасрэднікаў першага склікання (1861–1863 гг.) да непрадузятага складання ўстаўных грамат[11]. Увядзенне інстытута земскіх начальнікаў савецккімі гісторыкамі разглядалася ў якасці контррэформы ў структуры мясцовага кіравання[12]. А. Ф. Смірноў даследаваў паўстанне 1863–

---

[8] Ленин, В. И. Рабочая партия и крестьянство / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. – Изд. 5-е / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Т. 4 : 1898 – апр. 1901. – М. : Госполитздат, 1967. – С. 430.

[9] Дружинин, Н. М. Русская деревня на переломе, 1861–1880 гг. / Н. М. Дружинин. – М. : Наука, 1978. – 287 с.; Зайончковский, П. А. Проведение в жизнь крестьянской реформы 1861 г. / П. А. Зайончковский. – М. : Соцэкгиз, 1958. – 470 с.

[10] Чернуха, В. Г. Крестьянский вопрос в правительственной политике России (60–70 гг. XIX в.) / АН СССР. Ин-т истории СССР. Ленингр. отд-ние. – Ленинград : Наука. Ленингр. отд-ние, 1972. – 226 с.

[11] Устьянцева, Н. Ф. Институт мировых посредников в крестьянской реформе / Н. Ф. Устьянцева // Великие реформы в России = Russia's great reforms, 1856–1874 : [Сб.] / под ред. Л. Г. Захаровой, Б. Эклофа, Дж. Бушнелла. – М. : Изд-во МГУ, 1992. – 333 с.

[12] Зайончковский, П. А. Российское самодержавие в конце XIX столетия : (Политическая реакция 80-х – начала 90-х годов) / П. А. Зайончковский. – М. : Мысль, 1970. – 444 с.; Либерман, А. А. Институт земских начальников 1889–1905 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : (07.00.02) / А. А. Либерман ; МГУ. Ист. фак. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1976. – 18 с.

1864 гг. і закрануў урадавую палітыку ў дачыненні да дваранства рымска-каталіцкага веравызнання[13].

У савецкай гістарыяграфіі няма спецыяльных даследаванняў, якія б раскрывалі сістэму органаў мясцовага кіравання па сялянскіх справах. Але практычна ўсе аўтары, якія займаліся вывучэннем аграрнага сектара эканомікі, так ці інакш закраналі іх паўнамоцтвы і ўскосна сведчылі пра вынікі дзейнасці. З гэтай прычыны набываюць важнае значэнне работы агульнага характару А. М. Анфімава, С. М. Дуброўскага, Н. А. Ешгіазаравай, Б. Р. Літвака, С. М. Сідзельнікава, П. Р. Рындзюнскага і інш. [14]

У беларускай савецкай гістарыяграфіі таксама панаваў марксісцка-ленінскі падыход у даследаванні сацыяльна-эканамічных адносін у парэформеннай вёсцы. Гісторыкі распрацоўвалі пытанні эканамічнага і юрыдычнага становішча сялян да і пасля адмены прыгону, асаблівасцей надзялення іх зямлёй на тэрыторыі Беларусі ў выніку паўстання 1863–1864 гг., развіцця сялянскага руху, дынамікі землеўладання і землекарыстання. Да такіх работ трэба аднесці даследаванні У. І. Пічэты, М. В. Доўнар-Запольскага, У. М. Ігнатоўскага, К. І. Кернажыцкага, Д. А. Дудкова[15].

М. Б. Фрыдман раскрыла працэс падрыхтоўкі і абмеркавання праектаў рэформы 1861 г. у губернскіх і павятовых камітэтах і ва ўрадавых колах, аднак

---

[13]Смирнов, А. Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии / А. Ф. Смирнов; Акад. наук СССР. Ин-т истории. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – 392 с.

[14] Анфимов, А. М. Крестьянское хозяйство Европейской России, 1881–1904 / А. М. Анфимов. – М. : Наука, 1980. – 239 с.; Дубровский, С. М. Сельское хозяйство и крестьянство России в период империализма / С. М. Дубровский; [Вступ. статья д-ра ист. наук, проф. Г. А. Арутюнова] ; АН СССР. Ин-т истории СССР. – М. : Наука, 1975. – 398 с.; Ешгиазарова, Н. А. Аграрный кризис конца XIX века в России / Н. А. Ешгиазарова; Акад. наук СССР. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1959. – 192 с.; Литвак, Б. Г. Русская деревня в реформе 1861 года: Черноземный центр 1861–1895 гг. / Б. Г. Литвак; АН СССР. Ин-т истории СССР. – М. : Наука, 1972. – 423 с.; Сидельников, С. М. Аграрная политика самодержавия в период империализма / С. М. Сидельников. – М. : Изд-во МГУ, 1980. – 288 с.; Рындзюнский, П. Г. Утверждение капитализма в России 1850–1880 гг. / П. Г. Рындзюнский. – М. : Наука, 1978. – 295 с. і інш.

[15] Пичета, В. И. Помещичье хозяйство накануне реформы / В. И. Пичета // Великая реформа. Русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем : в 6 т. / Ред. А. К. Дживелегова, С. П. Мельгунова, В. И. Пичета; Ист. комис. учеб. отдела ОРТЗ. – Юбил. изд. – М. : Т-во И. Д. Сытина, 1911. – Т. 3. – С. 105–138; Пічэта, У. І. Гісторыя Беларусі / У. І. Пічэта. – Мінск : Выдавецкі цэнтр Бел. дзярж. ун-та, 2005. – 178 с.; Игнатовский, В. М. Белоруссия: территория, население, экономика, важнейшие моменты истории / В. М. Игнатовский. – Изд. 2-е. – Минск : Белгосиздат, 1925. – 32 с.; Довнар-Запольский, М. В. Народное хозяйство Белоруссии, 1861–1914 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Изд. Госплана БССР, 1926. – 240 с.; Дудкоў, Д. А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX і пачатку XX стст. / Д. А. Дудкоў. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1932. – 202 с.; Кернажыцкі, К. І. Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной / К. І. Кернажыцкі. – Мінск : [Б. в.], 1932. – 102 с.

яе ўвага была засяроджана на ўмовах надзялення сялян зямлёй, вызначэнні памераў выкупных плацяжоў і інш. [16] Манаграфія М. М. Улашчыка прысвечана вывучэнню перадумоў аграрнай рэформы 1861 г. на тэрыторыі Літвы і Заходняй Беларусі[17], М. Ф. Шпакаў прааналізаваў пытанні, звязаныя з рэалізацыяй рэформы ў Магілёўскай губ.[18], А. Ц. Караткевіч – у Віцебскай губ.[19]. Увядзенне інстытута земскіх начальнікаў у Беларусі вывучаў Ф. Р. Бялевіч[20]. У працах Л. П. Ліпінскага, К. І. Шабуні, В. П. Панюціча, Х. Ю. Бейлькіна, С. М. Самбук, А. І. Кажушкова, П. Д. Верашчагіна раскрываюцца сацыяльна-эканамічныя працэсы, якія адбываліся ў беларускай вёсцы. Дзейнасць мясцовых улад упамінаецца ўскосна, у якасці ілюстрацыйнага матэрыялу для характарыстыкі ўрадавай аграрнай палітыкі[21].

У цэлым, у савецкай гістарыяграфіі знайшлі пэўнае адлюстраванне ўсе мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах, вызначана іх роля як рэакцыйная, накіраваная супраць саміх сялян, а дзейнасць – як прдваранская. Такі падыход быў выкліканы метадалагічным манізмам, аснову якога складаў партыйна-

---

[16]Фридман, М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии / М. Б. Фридман; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск : Изд-во Белгосуниверситета, 1958. – 200, [2] с.

[17]Улащик, Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. В Литве и Западной Белоруссии / Н. Н. Улащик; Акад. наук СССР. Ин-т истории. – М. : Наука, 1965. – 479 с.

[18] Шпаков, М. Ф. Реализация реформы в Могилевской губернии / М. Ф. Шпаков // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы за 1963 г. / Акад. наук СССР. – Вильнюс, 1965.

[19]Короткевич, А. Т. Отмена крепостного права в Витебской губернии : автореф. дис. … канд. ист. наук / А. Т. Короткевич; М-во культуры СССР. Моск. гос. ист.-архивный ин-т. – М., 1954. – 18 с.

[20] Белевич, Ф. Р. Ограничение принципов судебной реформы 1864 г. и введение земских начальников в Белоруссии / Ф. Р. Белевич // Материалы к IX конф. молодых ученых : Обществ. науки / под общ. ред. и с предисл. акад. проф. Т. С. Горбунова ; Акад. наук БССР. Отд-ние обществ. наук. – Минск : Б. и., 1964. – 201 с.

[21] Липинский, Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 254 с.; Липинский, Л. П. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии / Л. П. Липинский. – Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. – 221, [2] с.; Шабуня, К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. / К. И. Шабуня. – Минск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1962. – 435 с., 6 отд. л. табл.; Панютич, В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861–1914 гг. / В. П. Панютич. – Минск : Наука и техника, 1969. – 190 с., 1 л. схем.; Кожушков, А. И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века / А. И. Кожушков. – Минск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1963. – 87 с.; Верещагин, П. Д. Крестьянские переселения из Белоруссии: вторая половина XIX в. / П. Д. Верещагин; науч. ред. К. И. Шабуня. – Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. – 144 с.; Самбук, С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С. М. Самбук; ред. В. П. Панютич. – Минск : Наука и техника, 1980. – 224 с.; Бейлькин, Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии, 1861–1914 гг. / Х. Ю. Бейлькин; науч. ред. М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1989. – 286 с.

класавы падыход. Пры гэтым даследчыкамі быў апрацаваны вялікі масіў дакументаў і матэрыялаў, што ўзбагаціла крынічную базу па праблеме.

З набыццём Рэспублікай Беларусь дзяржаўнай незалежнасці цікавасць да аграрнай гісторыі не знізілася. Многія гісторыкі савецкага перыяду працягвалі сваю плённую працу: В. П. Панюціч, Х. Ю. Бейлькін, У. П. Крук і інш.[22] Значны ўнёсак у вывучэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі парэформеннага перыяду зрабіў В. П. Панюціч[23]. Спецыяльна не разглядаючы структуру і функцыі органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання, ён адлюстраваў вынікі іх дзейнасці ў рэалізацыі асноўнай функцыі – пазямельнага ўладкавання сельскага насельніцтва ўсіх катэгорый.

Асобныя аспекты кадравай палітыкі, дзяржаўнай службы, функцыянавання мясцовых органаў кіравання і саслоўнага самакіравання, сацыяльнай трансфармацыі беларускага грамадства знайшлі адлюстраванне ў работах А. П Жытко, А. Г. Кахаunion ўскага, С. М. Токця, А. Ю. Бендзіна, В. І. Якаўчука, С Ф. Шымуковіча і інш. [24]

[22] Бейлькин, Х. Ю. Аграрный кризис конца XIX века и структурная реконструкция сельского хозяйства Беларуси / Х. Ю. Бейлькин. – Минск : Белорусская наука, 2001. – 190 с.; Бейлькин, Х. Ю. Капиталистическая трансформация сельского хозяйства Беларуси в начале XX века (1901–1914 гг.) / Х. Ю. Бейлькин. – Гомель : Центр исследования институтов рынка, 2006. – 296 с.; Крук, У. П. Сялянскі рух на Беларусі, 1864–1900 гг. / У. П. Крук ; Акадэмія навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 175 с.

[23] Панютич, В. П. Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси, 1861–1914 гг. / В. П. Панютич ; под ред. чл.-корр. АН Беларуси П. Т. Петрикова ; АН Беларуси. Ин-т истории. – Минск : Навука і тэхніка, 1996. – 142 с.; Панютич, В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. / В. П. Панютич ; науч. ред. П. Г. Козловский. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 373, [2] с.; Панютич, В. П. Историография аграрной истории Беларуси 1861–1917 гг. / В. П. Панютич. – Минск : ГНУ «Институт истории НАН Беларуси», 2005. – 262 с.

[24] Жытко, А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. : манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.; Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2013. –335 с.; Токць, С. М. Мясцовая шляхта і дзяржаўная адміністрацыя Расійскай імперыі ў Гродзенскай губерні: лаяльнасць і супраціў: 1802–1860-я гады / С. М. Токць. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2019. – 382 с.; Токць, С. М. Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / С. М. Токць. – Мінск : ДІКСТ БДУ, 2016. – 327 с.; Бендин, А. Ю. Михаил Муравьев-Виленский: усмиритель и реформатор Северо-Западного края Российской империи / А. Ю. Бендин. – М. : Книжный мир, 2017. – 416 с.; Якаўчук, В. І. Фарміраванне дзяржаўнага апарату ў заходніх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. / В. І. Якаўчук // Весн. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2009. – № 2. – С. 29–33; Шимукович, С. Ф. Некоторые аспекты функционирования системы государственного управления на территории Беларуси в XIX в. / С. Ф. Шимукович // Научные труды РИВШ. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. : в 2 ч. – Минск : РИВШ, 2009. – Ч. 1, вып. 8 (13) / под ред. В. Ф. Беркова. – С. 191–197.

У агульных рысах праблемы фарміравання і функцыянавання органаў мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусі акрэслены ў калектыўных выданнях айчынных гісторыкаў: «Нарысы гісторыі Беларусі», «Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён» (т. 2),«Гісторыя Беларусі» (т. 4), «Беларуская энцыклапедыя», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» (т. 1), «Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг.», «История белорусской государственности» (т. 2), «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII — пачатак XX ст.)» [25] і інш.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі адзначаецца інтарэс да дзейнасці асобных структурных элементаў мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, абаронены шэраг кандыдацкіх дысертацый[26].

[25] Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 1. – 1994. – 527 с.; Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. – Т. 2 : Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгаўз, Х. Ю. Бейлькін, А. Р. Бухавец [і інш.]; пад рэд. В. П. Панюціча. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 552 с.; Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – 519 с.; Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоў. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1998. – Т. 1–18; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Экаперспектыва, 1993–2003; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. – Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад навук Беларусі; Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 584 с.; Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 572 с., іл.; История белорусской государственности : в 5 т. Т. 2 : Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.) / Н. В. Смехович [и др.] ; отв. ред. тома: Н. В. Смехович, А. В. Унучек, Е. Н. Филатова ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2019. – 413 с.; Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII — пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2020. – 684 с.

[26] Страленя, А. А. Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.): дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А. А. Страленя. – Минск, 2017. – 169 л.; Подорожняя, Е. А. Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.): структура, функции, кадры : дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. А. Подорожняя. – Минск, 2014. – 180 л.; Долгач, Т. В. Губернские по крестьянским делам присутствия на территории Беларуси: формирование, структура, деятельность (1861–1903 гг.): дис. …канд. ист. наук: 07.00.02 / Т. В. Долгач. – Минск, 2019. – 200 с.; Таранович, К. Ю. Деятельность землеустроительных комиссий по реализации столыпинской аграрной реформы в Беларуси (1906–1917 гг.): дис. ... канд. истор. наук: 07.00.02 / К. Ю. Таранович. – Минск, 2016. – 239 л.; Кухаренко, А. А. Деятельность крестьянского поземельного банка на территории Беларуси (1883–1914 гг.) : дис.… канд. истор. наук: 07.00.02 / А. А. Кухаренко. – Минск, 2015. – 165, [1] л.

У постсавецкай расійскай гістарыяграфіі пытанне дзяржаўнага кіравання ў заходніх губернях атрымала шырокае асвятленне. З'явіўся шэраг калектыўных і манаграфічных выданняў, у якіх знайшлі адлюстраванне праблемы стварэння і функцыянавання адміністрацыйнага апарату ў Расійскай імперыі, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі[27].

Змены ў сістэме кіравання на тэрыторыі Беларусі расійскія аўтары звязваюць з паўстаннем 1863–1864 гг. і нацыянальнымі рухамі[28]. Пытанні суадносін імперскіх і нацыянальных наратываў, рэалізацыі палітыкі русіфікацыі у сучаснай гістарыяграфіі ўздымаюць А. Мілер, Л. Гарызонтаў, М. Д. Далбілаў[29]. Адносна шырокая характарыстыка заканадаўчай базы функцыянавання органаў мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусі была праведзена М. І. Красняковым[30]. А. А. Камзолава засяродзіла ўвагу на дзейнасці віленскіх генерал-губернатараў, раскрыла індывідуальны ўклад кожнага з іх у агульную праграму ўрадавых мерапрыемстваў у краі[31].

Для сучаснай украінскай гістарыяграфіі актуальнымі з'яўляюцца тыя ж дыскурсы, як і для беларускай. Агульныя падыходы ўрада да ажыццяўлення аграрных рэформ, пазямельнага ўладкавання сельскага насельніцтва і рэфармавання мясцовых дзяржаўных устаноў у заходніх губернях актуалізуюць цікавасць да работ украінскіх навукоўцаў. Асаблівасці рэалізацыі аграрных

[27] Государственность России: государственные и церковные учреждения, сословные органы и органы местного самоуправления, единицы административно-территориального, церковного и ведомственного деления (конец XV – февраль 1917 г.) : словарь-справочник : в 6 кн. / редкол.: В. П. Козлов (председатель) [и др.]; Федеральная архивная служба России, Всероссийский научно-исследовательский ин-т документоведения и архивного дела. – М. : Наука, 1996–2009; Институт генерал-губернаторства и наместничества в Российской империи: в 2-х т. / Т. А. Алексеева [и др]. – СПб. : Юрид. Центр Пресс, 2003. – Т. 1–2.

[28] Западные окраины Российской империи / под ред. А. Миллера. – М. : Новое литературное обозрение, 2007. – 608 с.; Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления / отв. Ред. С. Г. Агаджанов, В. В. Трепавлов. – М. : Славянский диалог, 1998. – 416 с.

[29] Миллер, А. И. Империя Романовых и национализм: эссе по методологии исторического исследования / А. И. Миллер. – М. : Новое литературное обозрение, 2008. – 248 с.; Горизонтов, Л. Е. Парадоксы имперской политики: Поляки в России и русские в Польше. – М. : Индрик, 1999. – 270 с.; Долбилов, М. Д. Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов ; Гос. ун-т. высш. шк. экономики, фак. истории. – М. : Новое литературное обозрение, 2010. – 999 с.

[30] Красняков, Н. И. Западные национальные регионы в системе государственного управления Российской империи в XVIII – начале XX в. Закрепление автономистской традиции в российской государственности: монография / Н. И. Красняков. – Екатеринбург : Изд-во УрАГС, 2009. – 208 с.

[31] Комзолова, А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М. : Наука, 2005. – 383 с.

рэформ знайшлі сваё ўвасабленне ў шэрагу калектыўных выданняў, манаграфій і артыкулаў[32].

Сучасныя польскія даследчыкі В. Сліковска, Р. Юрковскі, Л. Заштовт, С. Ланец, С. Вех і інш. асноўную ўвагу надаюць вывучэнню прычын, ходу, вынікаў і наступстваў паўстання 1863–1864 гг. і фарміравання адміністрацыйнага апарату, у абавязкі якога ўваходзіла барацьба з тэрарызмам і падаўленне праяў польска-каталіцкага радыкалізму[33].

Літоўскія вучоныя Д. Сталюнас, Т. Байрашаўскайтэ і інш. даследуюць, галоўным чынам, нацыянальную палітыку расійскага ўрада і міжнацыянальныя адносіны ў краі, а таксама падыходы ўлад да фарміравання чыноўніцкага корпуса ў мясцовых установах, у тым ліку па сялянскіх справах[34].

---

[32]Бармак, М. В. Формування російської імперської системи державної служби на українських землях (XVIII–XIX ст.) / М. В. Бармак. – Тернопіль : Видавництво Астон, 2016. – 392 с.; Влада і суспільство в Україні. Історичний контекст / Відп. ред. В.А. Смолій. – К.: НАН України, Інститут історії України, 2013. – 506 с.; Борисевич, С. О. Законодавче регулювання поземельних відносин та його соціальні наслідки для Правобережної України (1793−1886 роки) : дис. … д-ра іст. наук : захищена 27.11.2009 / С. О. Борисевич ; Ін-т історії України НАН України. – К., 2009. – 524 арк.; Шандра, В. С. Генерал-губернаторства в Україні: XIX – початок XX століття : моограія / В. С. Шандра. – Київ : Інститут історії України НАН України, 2005. – 427 с.; Власюк, І. М. Вплив столипінської аграрної реформи на соціально-економічний розвиток Правобережної України (1906–1914 рр.) : автореф. дис. … канд. іст. наук : 07.00.01 / І. М. Власюк; Інститут історії України НАН України. – Київ, 2000. – 20 с.; Скрипник, А. Ю. Діяльність адміністративних установ Подільської губернії (1793–1914 рр.) : дис. … канд. іст. наук : 07.00.01 / А. Ю. Скрипник. – Київ, 2006. – 245 с. і інш.

[33]Śliwowska, W. Petersburg i społeczeństwo rosyjskie wobec kwestii polskiej w przededniu i w czasie powstania styczniowego / W. Śliwowska // Powstanie styczniowe 1863—1864: wrzenie, bój, Europa, wizje / pod red. S. Kalembki. – Warszawa : PWN, 1990. – 760, [1] s.– S. 542-548; Jurkowski, R. Kowieński marszałek, grodzieński gubernator. Kresowe początki kariery politycznej Piotra Stołypina (1889–1903) / R. Jurkowski. – Olsztyn : Wydawnictwo Uniwersytetu Warmińsko-Mazurskiego, 2015. – 616 s.; Sikorska-Kulesza, I. Deklasacja drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX w. / I. Sikorska-Kulesza. – Warszawa : Oficyna Wydawnicza „AJAKS”, 1995. – 114 s.; Zasztowt, L. Europa Środkowo-Wschodnia a Rosja XIX—XX wieku: w kręgu edukacji i polityki / L. Zasztowt. – Warszawa : Uniwersytet Warszawski, Studium Europy Wschodniej, Przegląd Wschodni, 2007. – VII, 561 c.; Łaniec, S. Litwa i Białoruś w dobie konspiracji i powstania zbrojnego: 1861-1864 / S. Łaniec. – Olsztyn : Ośrodek Badań Nauk. Im. Wojciecha Kętrzyńskiego w Olsztynie, 2002. – 196 s.; Łaniec, S. Ziemie białoruskie w latach reformy agrarnej, manifestacji patriotycznych i konspiracji narodowej: 1860-1862 / S. Łaniec. – Toruń : Top Kurier, 1998. – 77 s.; Wiech, S. «Dyktatura serca». Na zachodnich rubieżach Cesarstwa Rosyjskiego: dzieje kariery wojskowo-urzędniczej Piotra Albiedynskiego (1826–1883) / S. Wiech. – Kielce : Wydaw. Uniw. Humanistyczno-Przyrodniczego Jana Kochanowskiego, 2010. – 314 s.; Wiech, S. Litwa i Białoruś. Od Murawjowa do Baranowa (1864–1868) / S. Wiech. – Kielce : Wydaw. Uniw. Jana Kochanowskiego, 2018. – 333 s.

[34] Staliūnas, D. Making Russians. Meaning and practice of russification in Lithuania and Belarus after 1863 / D. Staliūnas. – Amsterdam ; New York : Rodopi, 2007. – XII, 465 p.; Байрашаускайте, Т. Институт предводителей дворянства в Западных губерниях Российской империи во второй половине XIX в. – начале XX в. (Виленская и Ковенская губерния) //

У заходняй гістарыяграфіі ўрадавы апарат Расіі, яго колькасны і сацыяльны склад вывучаюцца ў рамках «новай палітычнай гісторыі»[35]. Гэту дысцыпліну адрознівае цікавасць да функцыянавання сацыяльных структур і ўладных механізмаў, палітычнай культуры рускага чыноўніцтва. У апошнія дзесяцігоддзі сучасную замежную гістарыяграфію цікавяць пытанні ўзаемадзеяння цэнтра і перыферыі, розных груп насельніцтва, нявызначанасць працэсаў фарміравання нацыянальных ідэнтычнасцей[36]. Адначасова ў працах амерыканскіх гісторыкаў ставіцца пытанне пра недахоп адпаведных навуковых даследаванняў[37].

Такім чынам, у беларускай і замежнай гістарыяграфіі актыўна працягваецца вывучэнне сістэмы органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання. Але да гэтага часу комплекснай абагульняючай работы аб дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі з 1861 па 1914 г. не створана, што актуалізуе прадмет даследавання.

*У раздзеле 1.2 “Характарыстыка крыніц”* для раскрыцця навуковай праблемы крыніцы прадстаўлены двума асноўнымі тыпамі. Першая група – неапублікаваныя матэрыялы справаводства. Другую групу складаюць

---

Bialoruskie Zeszyty Historyczne. – 2014. – № 41. – S. 67–92; Байрашаўскайтэ, Т. Працэс дэклясацыі шляхецкага саслоўя Літвы: доказы паходжаньня (канец XVIII – 60-я гг. XIX ст.) / Т. Байрашаўскайтэ // ARCHE. – 2009. – № 9. – С. 149–174.

[35] Миллер, А. И. Империя Романовых и национализм: эссе по методологии исторического исследования / А. И. Миллер. – М. : Новое литературное обозрение, 2008. – 248 с.

[36] Верт, Пол. В. Православие, инославие, иноверие: очерки по истории религиозного разнообразия Российской империи / Пол Верт ; [пер. с англ. Н. Мишаковой и др.]. – М. : Новое литературное обозрение, 2012. – 275 с.; Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет: антология / сост. П. Верт, П. С. Кабытов, А. И. Миллер. – М. : Новое издательство, 2005. – 696 с.; Fajnhaus, D. 1863: Litwa i Białoruś / D. Fajnhauz; Inst. Historii PAN. – Warszawa : NERITON :, 1999. – 357 c.; Hoch, S. L. Serfdom and social control in Russia : Petrovskoe, a village in Tambov / S. L. Hoch. – Chicago ; London : Univ. of Chicago press, 1986. – X, 220 c.; Weissman, N. B. Reform in Tsarist Russia. The State Bureaucracy and Local Government, 1900–1914 / N. B. Weissman // New Brunswick, New Jersey : Rutgers University Press, 1981. – 292 p.; Pearson, T. S. Russian Officialdom in Crisis. Autocracy and Local Self-Government, 1861–1900 / T. S. Pearson. Cambridge: Cambridge University Press, 1989. – 246 p.; Weeks, T. R. Nation and the State in late imperial Russia: Nationalism and Russification on the Western frontier, 1863–1914 / T. R.Weeks. – DeKalb : Northern Illinois univ. press, 1996. – [7], 297 p.; Weeks, T. Russification and the Lithuanians, 1863–1905 / T. Weeks // Slavic review. – Chicago, 2001. – Vol. 60. – № 1. – P. 96–114; Каппелер, А. Россия – многонациональная империя: Возникновение. История. Распад / А. Каппелер; Пер. с нем.: С. Червонная. – М. : Прогресс-Традиция, 2000. – 342 с.; Хоскинг, Дж. Россия: народ и империя (1552–1917) / Дж. Хоскинг; Пер. с англ. С. Н. Самуйлова. – Смоленск : Русич, 2000. – 510 с.

[37]Late imperial Russia. Problems and prospects / Ed. by I. D. Thatcher. – Manchester and New York : Manchester University Press, 2005. – P. 8.

апублікаваныя дакументальныя матэрыялы, якія ўключаюць нарматыўна-прававыя акты, статыстычныя матэрыялы, даведнікі, перыядычны друк, матэрыялы асабістага паходжання і інш.

Найбольш інфарматыўнымі з’яўляюцца матэрыялы вышэйшых урадавых устаноў, спецыяльных камісій, якія адкладаліся ў фондах Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Санкт-Пецярбургу (РДГА). Іх матэрыялы – журналы пасяджэнняў, перапіска, даведкі розных міністэрстваў і ведамстваў па абмяркоўваемых пытаннях – не толькі даюць магчымасць прасачыць ход распрацоўкі законапраектаў, але і прычыны іх перагляду.

Крыніцы з фондаў нацыянальных гістарычных архіваў Беларусі ў Мінску і Гродна, а таксама Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільнюсе дазваляюць прааналізаваць эвалюцыю аграрнай палітыкі ўрада на тэрыторыі Беларусі. Фонды губернатараў, губернскіх і павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей, міравых пасрэднікаў і іх павятовых з’ездаў, павятовых па чыншавых справах прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў, губернскіх прысутнасцей, губернскіх і павятовых землеўладкавальных камісій утрымліваюць шэраг дакументаў справаводства, якія раскрываюць практычную дзейнасць мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада на тэрыторыі Беларусі.

Сярод апублікаваных крыніц асаблівае значэнне маюць юрыдычныя акты, у якіх зафіксаваны склад, структура і функцыянальныя абавязкі мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання. Найбольш шырока яны прадстаўлены ў «Полном собрании законов Российской империи» і ў «Своде законов Российской империи». Разам з тым, гэты тып крыніц не заўсёды дакладна адлюстроўвае фактычнае становішча спраў на месцы.

У час падрыхтоўкі праектаў рэформ многія з іх публікаваліся. Каштоўныя даныя аб стане і дзейнасці мясцовых па сялянскіх справах устаноў, сялянскім землекарыстанні і інш. змяшчаюць даклад урадавай камісіі (Валуеўскай), якая даследавала становішча сельскай гаспадаркі Еўрапейскай Расіі ў пачатку 70-х гг. XIX ст.; заключэнні губернскіх нарад па перагляду заканадаўства аб сялянах 80-х гг. XIX ст.; працы мясцовых камітэтаў аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці пачатку XX ст. і інш. Указаныя крыніцы дапаўняюць і шматлікія друкаваныя статыстычныя матэрыялы.

Да важных крыніц адносяцца дакументы асабістага паходжання (мемуары, дзённікі і інш.). Успаміны міністра ўнутраных спраў П. А. Валуева, Віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва, старшыні Камітэта міністраў і Савета міністраў С. Ю. Вітэ, вядомага беларускага грамадскага дзеяча Э. Вайніловіча, а таксама мясцовых чыноўнікаў даюць магчымасць

прааналізаваць эвалюцыю падыходаў у рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада ў Беларусі. Успаміны міравых пасрэднікаў дазваляюць рэканструяваць іх практычную дзейнасць па рэалізацыі рэформы 1861 г. Адносіны да аграрных мерапрыемстваў урада зафіксаваны ва ўспамінах і жыхароў края, пераважна прадстаўнікоў шляхты.

Штогадовыя «Памятные книжки…», «Обзоры…» губерняў і «Адрес-календари…» даюць магчымасць прасачыць эвалюцыю кадравага складу і выніковасці дзейнасці мясцовых па сялянскіх справах установ. Аграрныя працэсы, што адбываліся ў вёсцы, у пэўнай ступені знайшлі сваё адлюстраванне ў матэрыялах перыядычнага друку.

У *раздзеле 1.3 “Метадалогія і канцэпцыя даследавання”* указваецца, што складанасць раскрыцця прадмета даследавання патрабуе сінтэзу разнастайных метадалагічных падыходаў. Яно праведзена на аснове прынцыпаў гістарызму, аб’ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу. Рэалізацыя прынцыпу гістарызму прдугледжвала вывучэнне прадмета даследавання ў развіцці ад генезісу да завершанасці. Пры гэтым мы выходзілі за часавыя межы ў тых выпадках, калі неабходна было раскрыць перадумовы стварэння мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі ці вынікі іх дзейнасці. Для аб’ектыўнага разумення сутнасці аграрнай палітыкі ўрада дзейнасць усіх урадавых інстытуцый кіравання разглядалася праз прызму ўзаемадзеяння з іншымі працэсамі, якія працякалі ў палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах. Аб’ектыўнасць высноў дасягалася апорай на інфармацыю рознапланавых крыніц, вынікі даследаванняў іншых аўтараў, спалучэннем верыфіцыраваннага эмпірычнага матэрыялу з прынцыпам каштоўнаснага падыходу.

Практычным інструментарыем даследавання выступалі агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, аналогія, мадэліраванне і інш.), канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны) і спецыяльна-юрыдычныя (фармальна-юрыдычны і параўнальна-прававы) метады. У прыватнасці, пры наяўнасці супярэчлівай інфармацыі ці наогул яе адсутнасці шырока выкарыстоўваліся метады індукцыі і аналогіі. Гэта тычыцца праблемы фарміравання кадравага складу адпаведных дзяржаўных устаноў. З вялікай доляй верагоднасці былі выяўлены чыноўнікі, якія прыбылі на службу не з беларускіх губерняў. Прымяненне гісторыка-тыпалагічнага метаду дазволіла ўпершыню ў гістарычнай навуцы вылучыць і абгрунтаваць два этапы аграрнай палітыкі расійскага ўрада, даць перыядызацыю працэсу стварэння і дзейнасці спецыяльна створаных мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па яе

рэалізацыі, устанавіць розначасовасць і рознапрасторавасць іх функцыянавання. Для пазнання сутнасці праблемы і выхаду на тэарэтычныя абагульненні былі выкарыстаны такія метады, як сінтэз, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага, мадэліраванне, абстрагіраванне, ідэалізацыя, а таксама навуковыя тлумачэнні генетычнага, прычынна-выніковага, структурнага і функцыянальнага тыпаў.

Даследаванне грунтуецца на мадэрнізацыйнай тэарэтычнай парадыгме.

У цэлым рэалізацыя прынцыпаў, выкарыстанне агульнанавуковых і канкрэтна-гістарычных метадаў, навуковых тлумачэнняў у сваёй сукупнасці дазволілі выявіць канцэптуальны змест урадавай аграрнай палітыкі, сутнасныя бакі дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі ў Беларусі ў 1861–1914 гг. На аснове гэтага сфармулявана **канцэпцыя даследавання**.

Канцэптуальным зместам аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў 1861–1914 гг. з’яўлялася мадэрнізацыя сацыяльна-эканамічных адносін у аграрным сектары эканомікі. У гэтым гістарычным працэсе выяўлены два этапы. Першы ахапіў люты 1861 – кастрычнік 1906 г., на якім аб’ектам урадавай палітыкі выступала сялянская абшчына, з якою былі звязаны асноўныя аграрныя пераўтварэнні, якія ажыццяўлялі спецыяльна створаныя органы дзяржаўнага кіравання: інстытут міравых пасрэднікаў, іх павятовыя з’езды, паверачныя камісіі, павятовыя і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, павятовыя па чыншавых справах прысутнасці, інстытут земскіх начальнікаў, іх з’езды і губернскія прысутнасці.

Другі этап прыпадае на лістапад 1906–1914 г., сутнасць якога вызначала сталыпінская аграрная рэформа. На гэтым этапе аб’ектам аграрнай палітыкі з’яўляўся селянін як прыватная юрыдычная асоба, а ўсе мерапрыемствы непасрэдна ажыццяўлялі павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі, земскія начальнікі, іх павятовыя з’езды і губернскія прысутнасці.

Для практычнай рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. быў створаны спецыяльны орган – інстытут міравых пасрэднікаў. Міравыя пасрэднікі надзяляліся шырокім колам адміністрацыйных і судовых паўнамоцтваў. Галоўным функцыянальным абавязкам пасрэднікаў было зацвярджэнне (у некаторых выпадках і складанне) устаўных грамат, у якіх замацоўваліся памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцей. З пачаткам пераводу сялян беларускіх губерняў у 1863 г. на абавязковы выкуп міравыя пасрэднікі разам з членамі паверачных камісій зацвярджалі выкупныя акты. Адміністрацыйна-судовыя функцыі міравых пасрэднікаў былі звязаны таксама з арганізацыяй і дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання – сельскіх і валасных сходаў і іх праўленняў.

На павятовым узроўні ў якасці апеляцыйнай інстанцыі ствараліся з’езды міравых пасрэднікаў, якія разглядалі скаргі сялян і памешчыкаў на супярэчлівыя рашэнні міравых пасрэднікаў.

З 1886 г. у Беларусі ствараліся павятовыя па чыншавых справах прысутнасці, на якія ўскладвалася правядзенне чыншавай рэформы. Аднак, у параўнанні з рэформай памешчыцкай і дзяржаўнай вёскі, чыншавая праводзілася марудна, адной з прычын чаго з’яўлялася імкненне ўрада супрацьпаставіць былых саюзнікаў у паўстаннях – буйных землеўласнікаў і чыншавую шляхту.

На пачатку 70-х гг. XIX ст. у правячых колах імперыі сфарміравалася меркаванне, што інстытут міравых пасрэднікаў вычарпаў свае магчымасці. Да таго ж, растучыя фінансавыя выдаткі дзяржавы, інфляцыйныя працэсы прывялі да прыняцця закону ад 27 чэрвеня 1874 г., у адпаведнасці з якім замест міравых пасрэднікаў і іх з’ездаў былі створаны калегіяльныя органы кіравання толькі з адным штатным чыноўнікам – павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці, на якія ўскладваліся адміністрацыйныя функцыі былых міравых пасрэднікаў.

Да функцыянальных абавязкаў губернскай па сялянскіх справах прысутнасці адносіўся разгляд скаргаў на рашэнні міравых пасрэднікаў і іх з’ездаў, а з 1878 г. – павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей. Галоўным абавязкам прысутнасці з’яўлялася пазямельнае ўладкаванне розных катэгорый сельскага насельніцтва. Яна зацвярджала ўстаўныя граматы, а пазней – выкупныя і люстрацыйныя акты, якія перадаваліся ў Галоўную выкупную ўстанову. Прысутнасці кіравалі ўсімі справамі аб размеркаванні тэрыторыі на сельскія абшчыны і воласці не толькі былых памешчыцкіх, але і казённых сялян, вольных людзей, аднадворцаў, старавераў, праваслаўных арандатараў і іншых груп саслоўя сельскіх абывацелей, не ўласцівых унутраным губерням імперыі.

Асаблівасцю функцыянальных абавязкаў прысутнасцей ў беларускіх губернях з’яўлялася раскладка кантрыбуцыйнага збору з даходаў маёнткаў дваран-католікаў і іх нерухомай маёмасці ў гарадах і мястэчках. Дадзены збор эканамічна падрываў гаспадарку памесных дваран і даваў магчымасць павялічваць жалаванне чыноўнікам рускага паходжання.

Павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці паказалі няздольнасць аператыўна вырашаць пастаўленыя перад імі задачы. У сувязі з гэтым урад вырашыў вярнуцца да апрабаванай практыкі 1861–1863 гг. На падставе закону ад 12 ліпеня 1889 г. у паветах ствараўся інстытут земскіх начальнікаў. Разам з тым, увядзенне інстытута земскіх начальнікаў, наданне яму судовых функцый, ліквідацыя міравога суда з самага пачатку не адпавядалі новым рэаліям часу.

Гэта быў крок назад і ва ўсталяванні жорсткага кантролю над органамі сялянскага самакіравання. Пачатак рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы, якая прадугледжвала ліквідацыю пазямельнай абшчыны, пераўтварэнне селяніна ў прыватнага землеўласніка і наданне яму ўсіх юрыдычных правоў нараўне з іншымі сацыяльнымі групамі супярэчылі ўсім адміністрацыйным і судовым функцыям інстытута земскіх начальнікаў. Разам з тым, у адрозненне ад павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей, адміністрацыйная ўлада земскіх начальнікаў і іх з’ездаў запоўніла вертыкаль дзяржаўнага кіравання на павятовым узроўні.

На пачатку XX ст. у беларускіх губернях адбылася рэарганізацыя губернскіх устаноў, якія непасрэдна рэалізоўвалі аграрную палітыку ўрада. Імі сталі губернскія прысутнасці, якія кантралявалі і накіроўвалі дзейнасць земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў.

Сталыпінская аграрная рэформа стала важным крокам на шляху мадэрнізацыі аграрнага сектара эканомікі. Для яе практычнай рэалізацыі на месцах быў створаны спецыяльны механізм – павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі. Паспяховасць дзейнасці землеўладкавальных камісій напрамую залежала ад узаемадзеяння з існаваўшымі органамі мясцовага кіравання – земскімі начальнікамі, іх павятовымі з’ездамі, губернскімі прысутнасцямі і інш. На земскіх начальнікаў ускладваліся абавязкі своечасова і даходліва тлумачыць сялянам сэнс нарматыўна-прававых актаў па землеўладкванні. Яны павінны былі засведчваць прысуды сходаў аб выхадзе сялян з абшчыны, прымалі непасрэдны ўдзел у рабоце землеўладкавальных камісій па справах свайго ўчастка. Земскія начальнікі выдавалі хадачаскія пасведчанні і іншыя дакументы перасяленцам у Сібір і на Далёкі Ўсход.

Павятовыя з’езды земскіх начальнікаў разбіралі скаргі сялян на рашэнні сельскіх сходаў і земскіх начальнікаў па пытаннях выхаду вяскоўцаў з грамады і замацавання за імі надзельных зямель у асабістую ўласнасць. Зладжанае ўзаемадзеянне ўсіх звёнаў мясцовых органаў кіравання спрыяла рэалізацыі аграрнай рэформы і мадэрнізацыі сацыяльна-эканамічных адносін у вёсцы.

Арганізацыя і дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання па ажыццяўленні аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі мелі істотныя асаблівасці ў параўнанні з рускімі губернямі. Яны характарызаваліся living рознапрастораваcцю і розначасовасцю.

Скасаванне часоваабавязанага стану сялян і перавод іх на абавязковы выкуп на тэрыторыі Беларусі пачаліся значна раней, чым прадугледжвалася законамі 1861 г. У Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і інфляндскіх паветах Віцебскай губернях дзейнічалі паверачныя камісіі, што паскорыла

працэс пераводу сялян на абавязковы выкуп з аднačасовым павелічэннем у іх колькасці зямлі і памяншэннем выкупных плацяжоў. У гэтых губернях з 1869 г. праводзілася абавязковае адмежаванне сялянскіх і памешчыцкіх зямель.

Яшчэ адной адметнай асаблівасцю з’яўлялася тое, што рэарганізацыя мясцовых органаў кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі праводзілася ў больш позні тэрміны ў параўнанні з рускімі губернямі. Пры гэтым наглядаліся істотныя адрозненні па часе рэфармавання дадзеных устаноў у губернях Віленскага генерал-губернатарства і Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.

Важнай асаблівасцю ў беларускім краі з’яўляўся працэс фарміравання кадравага складу па сялянскіх справах устаноў, асабліва пасля выдання ўказа ад 27 мая 1864 г., у адпаведнасці з якім асобам польскага паходжання забаранялася займаць пасады ва ўсіх дзяржаўных па сялянскіх справах установах, што стрымлівала правядзенне аграрных пераўтварэнняў.

**У главе 2 “Стварэнне і дзейнасць мясцовых органаў кіравання па рэалізацыі рэформы 1861 г.”** раскрыты працэс стварэння і вынікі дзейнасці структурных частак сістэмы спецыяльных органаў мясцовага кіравання па правядзенні аграрнай рэформы 1861 г.

У *раздзеле 2.1 “Інстытут міравых пасрэднікаў”* паказана, што ўрад надаваў важнае значэнне стварэнню інстытута міравых пасрэднікаў напярэдадні рэформы. Вызначана, што іх асноўнымі функцыянальнымі абавязкамі былі ўладкаванне спрэчак паміж памешчыкамі і сялянамі пры зацвярджэнні ўстаўных грамат і выкупных актаў, а таксама арганізацыйнае афармленне і нагляд за функцыянаваннем органаў сялянскага самакіравання. Паказана, што ўрадавая пазіцыя ў дачыненні да фарміравання кадравага складу міравых пасрэднікаў была скарэктавана пад уплывам паўстання 1863–1864 гг. Функцыянальныя абавязкі міравых пасрэднікаў на тэрыторыі Беларусі былі больш разнастайнымі ў параўнанні з агульнарасійскімі, што было выклікана пазямельным уладкаваннем розных сацыяльных груп саслоўя сельскіх абывацелей.

*Раздзел 2.2 “Павятовыя з’езды міравых пасрэднікаў”* прысвечаны аналізу ролі павятовых з’ездаў міравых пасрэднікаў у рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада. Паказана, што першапачаткова галоўным абавязкам з’ездаў было зацвярджэнне ўстаўных грамат і выкупных актаў, а таксама разгляд скаргаў на рашэнні міравых пасрэднікаў. Вызначана, што асноўнай прычынай скарачэння колькасці павятовых з’ездаў (стварэнне аднаго з’езда на два-тры паветы) была палітычная матывацыя, звязаная з паўстаннем, што не спрыяла эфектыўнасці іх работы.

У *раздзеле 2.3 "Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці"* раскрыты асноўныя напрамкі дзейнасці названых інстытуцый. Галоўнымі задачамі прысутнасцей былі кіраўніцтва і назіранне за правільнасцю пазямельнага і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання сельскага насельніцтва.

Дзейнасць *павятовых паверачных камісій* паказана ў *раздзеле 2.4.* Іх стварэнне было прадугледжана "Местным положением…" для Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і частцы Віцебскай губерняў для праверкі правільнасці складання і зацвярджэння ўстаўных грамат. Аднак у сувязі з пачаткам паўстання ў 1863 г. заканадаўствам былі прадугледжаны больш шырокія паўнамоцтвы гэтых інстытуцый. Яны не толькі выпраўлялі недакладнасці ва ўстаўных граматах, але і складалі выкупныя акты з паніжэннем выкупной сумы. Спешнасць работ і недастатковая кампетэнтнасць некаторых камісій прыводзілі да шматлікіх парушэнняў і павелічэння сацыяльнай напружанасці ў вёсцы.

У **трэцяй главе "Рэфармаванне і дзейнасць па сялянскіх справах устаноў паводле законаў ад 27 чэрвеня 1874 г і 9 чэрвеня 1886 г."** прааналізавана сістэма органаў мясцовага кіравання, створаная ў адпаведнасці з заканадаўствам 1874 г. і 1886 г.

*Раздзел 3.1 "Рэарганізацыя губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях"* прысвечаны раскрыццю прычын і сутнасці рэфармавання сістэмы органаў мясцовага кіравання сялянамі ў 1874 г. Паказана, што прычынай рэфармавання стала імкненне да скарачэння фінансавых выдаткаў на мясцовыя па сялянскіх справах установы. Пры гэтым па палітычных прычынах новае заканадаўства ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях было ўведзена ў 1878 г., а на Віленскую і Гродзенскую губерні так і не распаўсюдзілася. У склад губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей замест прадстаўнікоў ад дваранства была ўведзена пасада неадменнага члена – чыноўніка МУС. Аднак недастатковая эфектыўнасць работы названых інстытуцый прывяла да далейшага рэфармавання мясцовых па сялянскіх справах устаноў.

*"Стварэнне і дзейнасць павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей"* раскрыты ў *раздзеле 3.2.* Калегіяльныя павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці прыйшлі на змену міравым пасрэднікам і іх павятовым з'ездам у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях у 1878 г. Новым органам былі перададзены абавязкі па пазямельным уладкаванні сельскага насельніцтва, назіранне за дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання і інш. Аднак, неадменны член павятовай па сялянскіх справах прысутнасці, які непасрэдна займаўся справамі сялян, не мог аднаасобна вырашаць узнікаўшыя праблемы. У выніку павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці былі не ў стане эфектыўна

ажыццяўляць кантроль над органамі сялянскага самакіравання і вырашаць аграрныя праблемы.

*У раздзеле 3.3 "Павятовыя па чыншавых справах прысутнасці"* раскрыта дзейнасць дадзеных інстытутаў у адпаведнасці з заканадаўствам 1886 г. Прысутнасці займаліся пазямельным уладкаваннем уласцівай толькі для заходніх губерняў сацыяльнай групы насельніцтва – сельскіх вечных чыншавікоў. Нявызначанасць прававога стану чыншавікоў, імкненне ўрада супрацьпаставіць іх сваім арэндадаўцам прывяла да зацягвання спраў па іх пазямельным уладкаванні на дзесяцігоддзі і павышэнню сацыяльнай напружанасці ў вёсцы.

**Глава 4 "Мясцовыя дзяржаўныя ўстановы па рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада ў Беларусі на пачатку XX ст."** прысвечана раскрыццю дзейнасці ўстаноў па сялянскіх справах, створаных на падставе заканадаўства 1889 г. і 1906 г.

*У раздзеле 4.1 "Падрыхтоўка ўвядзення закону ад 12 ліпеня 1889 г. на тэрыторыі Беларусі"* паказаны працэс падрыхтоўкі распаўсюджання закону ад 12 ліпеня 1889 г. на беларускія губерні. Рэфармаванне мясцовых па сялянскіх справах устаноў на тэрыторыі Беларусі пачало ажыццяўляцца толькі ў пачатку XX ст. у два этапы. У Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях гэта было зроблена ў 1901 г., таму што тут існавалі калегіяльныя павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці, дзейнасць якіх урадам была прызнана неэфектыўнай. Акрамя таго, тут да пачатку XX ст. колькасць каталіцкага і праваслаўнага пазямельнага дваранства амаль ураўнавалася. У Віленскай і Гродзенскай губернях праблемамі вёскі займаліся міравыя пасрэднікі і іх павятовыя з’езды, таму новыя ўстановы былі ўведзены напрыканцы 1903 г.

*У разделе 4.2 "Інстытут земскіх начальнікаў"* раскрыта роля земскіх начальнікаў у рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада на тэрыторыі Беларусі. Увядзенне пасады земскага начальніка, які сумяшчаў адміністрацыйныя і судовыя паўнамоцтвы, было вынікам імкнення ўрада стварыць больш эфектыўную сістэму па рэалізацыі аграрнай палітыкі. Аднак шматлікія нараканні з боку мясцовых улад і скаргі насельніцтва на дзейнасць земскіх участковых начальнікаў, а таксама адмена дваранскай прывілеі на замяшчэнне названай пасады прывялі да неабходнасці ўзмацніць кантроль над асабовым складам гэтых чыноўнікаў.

*Раздзел 4.3* прысвечаны *павятовым з’ездам земскіх начальнікаў*, якія фарміраваліся па той жа схеме, што і з’езды міравых пасрэднікаў па рэформе 1861 г. Былі падобныя і іх функцыянальныя абавязкі. Ускладанне на з’езды земскіх начальнікаў, разам з адміністрацыйнымі, судовых функцый

замаруджвала вырашэнне спраў. Складанасць пазямельнага ўладкавання спецыфічных для заходніх губерняў груп сельскага насельніцтва, недастатковае фінансаванне канцылярый, адсутнасць адказнага кіраўніка ў павятовых з’ездах прыводзілі да слабай эфектыўнасці іх работы.

У *раздзеле 4.4 “Губернскія прысутнасці”* паказана роля названых інстытуцый ў рэалізацыі аграрнай палітыкі дзяржавы. Ускладненне сацыяльна-эканамічных адносін у сельскай мясцовасці прывяло да неабходнасці рэфармавання губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей. Іх замянілі губернскія прысутнасці. На новы кіруючы орган былі ўскладзены задачы больш markazнабаковага маштабу ў параўнанні з папярэднімі прысутнасцямі. Непасрэдныя выканаўчыя функцыі ўскладваліся толькі на аднаго-двух неадменных членаў губернскай прысутнасці, што замаруджвала рэалізацыю іх функцый.

*“Узаемадзеянне землеўладкавальных камісій з інстытутам земскіх начальнікаў і губернскімі прысутнасцямі ў ходзе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы”* раскрываецца ў *раздзеле 4.5.* Для ажыццяўлення сталыпінскай аграрнай рэформы да склаўшайся сістэмы органаў мясцовага кіравання былі дастасаваны губернскія і павятовыя землеўладкавальныя камісіі. Паспяховасць дзейнасці камісій напрамую залежала ад узаемадзеяння з губернскімі прысутнасцямі, земскімі начальнікамі і іх павятовымі з’ездамі. Земскія начальнікі тлумачылі сялянам сэнс заканадаўства, засведчвалі прысуды грамад аб выдзяленні замлі пад адрубныя і хутарскія гаспадаркі, удзельнічалі ў рабоце павятовых землеўладкавальных камісій па справах свайго ўчастка, выступалі ў якасці землеўладкавальнікаў і інш. Павятовыя з’езды земскіх начальнікаў разбіралі скаргі сялян на рашэнні сельскіх сходаў і земскіх начальнікаў па пытаннях выхаду вяскоўцаў з грамады і замацавання за імі надзельных зямель у асабістую ўласнасць. Губернскія прысутнасці кіравалі работай падначаленых ім устаноў, сачылі за правільнасцю іх дзейнасці. Эфектыўнае ўзаемадзеянне ўсёй сістэмы мясцовых органаў кіравання спрыяла рэалізацыі аграрнай рэформы і мадэрнізацыі аграрнага сектара эканомікі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Канцэптуальным зместам аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў 1861–1914 гг. з’яўлялася мадэрнізацыя сацыяльна-эканамічных адносін у аграрным сектары эканомікі. На падставе сутнасных змен вылучаны два асноўныя этапы гэтай палітыкі. Першы – 1861–1906 гг. – характарызаваўся скасаваннем прыгону, якое прадугледжвала наданне асабістай свабоды сялянам, надзяленне

іх зямлёй праз выкуп з дапамогай дзяржавы. Пры гэтым уласнікам зямлі станавілася абшчына, а не асабіста селянін, за выключэннем падворнага землеўладання ў заходнім і цэнтральным рэгіёнах Беларусі. Галоўным аб'ектам дзяржаўнай палітыкі з'яўлялася абшчына, на якую ўскладваўся шэраг функцый. Галоўнай з іх была фінансава-фіскальная з кругавой парукай пры выплаце падаткаў і ўнясенні выкупных плацяжоў сялянамі. Другі этап адпавядае часу правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы, якая пачалася з канца 1906 г. Карэнным адрозненнем гэтага этапу з'яўляліся разбурэнне пазямельнай абшчыны, стварэнне прыватнаўласніцкіх адрубных і хутарскіх гаспадарак, наданне сялянам усіх грамадзянскіх правоў, імкненне ліквідаваць сялянскае малазямелле праз продаж казённай зямлі і перасяленні сялян у Сібір і на Далёкі Ўсход, прапаганда і ўкараненне перадавых метадаў гаспадарання.

Для рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі на першым этапе на месцах ствараліся і дзейнічалі спецыяльныя органы дзяржаўнага кіравання (1861–1878 гг. – інстытут міравых пасрэднікаў, іх павятовыя з'езды, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў 1861–1903 гг. – у Віленскай і Гродзенскай губернях; 1863–1867 гг. – паверачныя камісіі ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і інфляндскіх паветах Віцебскай губерняў; 1878–1901 гг. – павятовыя і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях; 1886–1917 гг. – павятовыя па чыншавых справах прысутнасці ва ўсіх беларускіх губернях; 1901–1917 гг. – інстытут земскіх начальнікаў і іх з'езды, губернскія прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў 1903–1917 гг. – у Віленскай і Гродзенскай губернях).

На другім этапе ўрадавую аграрную палітыку непасрэдна рэалізоўвалі павятовыя (з 1906 г.) і губернскія (з 1907 г.) землеўладкавальныя камісіі, земскія начальнікі, іх павятовыя з'езды і губернскія прысутнасці.

Такім чынам, стварэнне і дзейнасць мясцовых дзяржаўных па сялянскіх справах устаноў у беларускіх губернях характарызаваліся рознaчасовасцю і рознапрасторавасцю, што было выклікана асаблівасцямі сацыяльна-эканамічных адносін і палітычнай сітуацыяй у розных рэгіёнах Беларусі [1; 21; 22; 23; 24; 25; 26; 27; 29; 31; 32; 33; 35].

2. Для рэалізацыі рэформы 1861 г. упершыню ў гісторыі самадзяржаўнай Расіі быў створаны выбарны адмысловы орган – інстытут міравых пасрэднікаў. Ён не ўпісваўся ў іерархічную структуру вертыкалі органаў улады і кіравання, з'яўляўся практычна незалежным па спосабе фарміравання і функцыянальных абавязках не толькі ад мясцовых губернатараў і генерал-губернатараў, але і Міністэрства ўнутраных спраў. На сваёй пасадзе міравыя пасрэднікі

зацвярджаліся Сенатам і, адпаведна, маглі быць зняты з пасады гэтым вышэйшым органам. Першы склад міравых пасрэднікаў у асноўным прытрымліваўся ліберальных поглядаў і актыўна ўключыўся ў работу па правядзенні ў жыццё рэформы.

На тэрыторыі Беларусі інстытут міравых пасрэднікаў першапачаткова фарміраваўся з мясцовых памесных дваран рымска-каталіцкага веравызнання, якія складалі 93,3% ад агульнай колькасці дваран-землеўласнікаў. Правядзенне рэформы па часе супала з падрыхтоўкай паўстання па аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Большасць міравых пасрэднікаў беларускага краю апынулася ў апазіцыі да самадзяржаўнай Расіі. Гэта з'явілася падставай для татальнай замены міравых пасрэднікаў-католікаў выхадцамі з рускіх губерняў па прызначэнні ад урада. Змены ў фарміраванні кадравага складу міравых пасрэднікаў былі юрыдычна замацаваны ўказам ад 27 мая 1864 г., паводле якога асобам польскага паходжання забаранялася займаць службовыя пасады, блізка звязаныя з народам (сялянствам). Новых міравых пасрэднікаў з унутраных губерняў імперыі ўрад заахвочваў павялічаным жалаваннем, магчымасцю павышэння па службе, пенсіямі, чаго не мелі пасрэднікі ў рускіх губернях. Аднак, многія з іх не ведалі асаблівасцей пазямельных адносін у краі, не мелі падтрымкі сярод мясцовага дваранства, але імкнуліся выконваць распараджэнні мясцовай улады, ад якой знаходзіліся ў прамой залежнасці па службе.

Ва ўмовах паўстання ўрад зрабіў стаўку на падтрымку сялянства. З 1863 г. ліквідавалася часоваабавязанае становішча сялян Беларусі. Яны пераводзіліся на абавязковы выкуп. Міравых пасрэднікаў рымска-каталіцкага веравызнання абвінавацілі ў няправільным і марудным складанні ўставных грамат, пазбаўленні сялян лепшых земляў на карысць памешчыкаў і т. п. Граматы падлягалі праверцы, для чаго ствараліся паверачныя камісіі. У выніку памеры сялянскіх надзелаў у некаторых выпадках павялічыліся амаль на чвэрць, а выкупныя плацяжы значна панізіліся. Пры гэтым умовы надзялення сялян зямлёй ва ўнутраных губернях не мяняліся. Гэта з'яўляецца істотнай асаблівасцю рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. на тэрыторыі Беларусі.

У выніку ажыццяўлення рэформы 1866 г. дзяржаўныя сяляне былі перададзены пад юрысдыкцыю агульных мясцовых па сялянскіх справах устаноў. З 1867 г. казённыя сяляне Беларусі пераводзіліся на абавязковы выкуп, і іх пазямельнае ўладкаванне таксама адбывалася з удзелам міравых пасрэднікаў. Дакладнае вызначэнне ў законе ўмоў пераводу і несупярэчлівая праца чыноўнікаў Міністэрства дзяржаўных маёмасцей і міравых пасрэднікаў дала станоўчыя вынікі, што дазволіла дзяржаўным сялянам перайсці ў катэгорыю сялян-уласнікаў.

Важным абавязкам міравых пасрэднікаў з’яўляўся нагляд за дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання. Аднак іх увага галоўным чынам была накіравана на знешні бок функцыянавання службовых асоб сельскай грамады і воласці. Пры ўмове выканання апошнімі ўрадавых распараджэнняў, міравыя пасрэднікі не звярталі ўвагі на некаторыя негатыўныя наступствы іх дзейнасці.

У якасці апеляцыйнай інстанцыі на неадпаведнае закону складванне і зацвярджэнне ўстаўных грамат, для разгляду скаргаў памешчыкаў ці сялян на рашэнні міравых пасрэднікаў ствараліся павятовыя з’езды міравых пасрэднікаў. З’езды складаліся з павятовага прадвадзіцеля дваранства (старшыня), міравых пасрэднікаў павета і чыноўніка ад урада. На з’ездзе таксама разглядаліся пытанні па прадстаўленнях саміх міравых пасрэднікаў, патрабаваннях губернскай па сялянскіх справах прысутнасці ці губернатара.

Павятовы прадвадзіцель дваранства ўзначальваў з’езд да заканчэння тэрміну службы па выбарах. Аднак на тэрыторыі Беларусі апошнія выбары на дваранскіх сходах адбыліся ў канцы 50-х гг. XIX ст. З 1861 г. у краі пачаліся хваляванні сярод дваранства рымска-каталіцкага веравызнання. У сувязі з гэтым правядзенне дваранскіх сходаў у беларускіх губернях адтэрміноўвалася на няпэўны час. Таму прадвадзіцелі дваранства прызначаліся ад урада.

На падставе правілаў аб парадку пераводу ўстаўных грамат у выкупныя акты ад 8 кастрычніка 1863 г. і 2 сакавіка 1864 г. у склад кожнага міравога з’езда прызначаўся яшчэ адзін урадавы чыноўнік, які адначасова станавіўся старшынёй з’езда замест павятовага прадвадзіцеля дваранства. Аднак ужо з 1867 г. урад вярнуўся да агульнарасійскай практыкі прызначэння прадвадзіцелей дваранства на пасады старшынь з’ездаў міравых пасрэднікаў. Пры гэтым адначасова вырашалася і праблема запаўнення вакансій павятовых прадвадзіцелей дваранства выхадцамі з рускіх губерняў. Да гэтага часу пасада прадвадзіцеля дваранства была ганаровай і бясплатнай, таму жадаючых ехаць у губерні Паўночна-Заходняга краю было мала. Сумяшчэнне пасады прадвадзіцеля і старшыні з’езда дазволіла аплочваць пасаду прадвадзіцеля, які станавіўся звычайным чыноўнікам.

Паступовае скарачэнне функцыянальных абавязкаў міравых пасрэднікаў у сувязі з заканчэннем пазямельнага ўладкавання пераважнай большасці сельскага насельніцтва і рэалізацыя судовай рэформы далі падставы Міністэрству ўнутраных спраў хадайнічаць аб ліквідацыі інстытута міравых пасрэднікаў. З 1874 г. на змену міравым пасрэднікам і іх павятовым з’ездам прыйшлі калегіяльныя павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці. У Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях гэта адбылося ў 1878 г. У губернях Віленскага генерал-губернатарства інстытут міравых пасрэднікаў і іх з’езды

захаваліся. Разам з тым, з канца 70-х гг. XIX ст. у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях адбывалася паступовае скарачэнне колькасці міравых участкаў, што прывяло да стварэння аб'яднаных павятовых з'ездаў. У сілу гэтага многія прадвадзіцелі/старшыні пазбавіліся жалавання, што прывяло да павелічэння колькасці вакантных пасад. У адпаведнасці з указам ад 30 мая 1888 г. з'езды міравых пасрэднікаў былі адноўлены ў кожным павеце Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў. У выніку ўсе павятовыя прадвадзіцелі дваранства рымска-каталіцкага веравызнання былі заменены праваслаўнымі з памерам жалавання старшыні з'езда. Такая сітуацыя захавалася да 1 снежня 1903 г., калі ў названых губернях адкрыліся павятовыя з'езды земскіх начальнікаў.

Такім чынам, мясцовыя па сялянскіх справах установы у Беларусі не былі выбарным інстытутам з асяроддзя мясцовага памеснага дваранства нават у той абмежаванай форме, якая прымянялася ва ўнутраных губернях. Усе без выключэння службовыя асобы па сялянскіх справах установ з'яўляліся ўрадавымі чыноўнікамі, якія прызначаліся і звальняліся з пасады альбо Міністэрствам унутраных спраў, альбо генерал-губернатарамі. Таму ў дачыненні да міравых пасрэднікаў рускага паходжання і іх з'ездаў у заходніх губернях урад не меў падстаў прад'яўляць прэтэнзіі за злоўжыванні ці бяздзейнасць [1; 3; 4; 6; 7; 8; 9; 13; 14; 16; 17; 18; 21; 22; 24; 25; 27; 28; 29; 30; 28; 34; 36; 37; 41; 43; 47; 48; 51; 52; 54; 55; 56; 57; 58; 61; 62; 65; 66; 71; 72; 73; 80; 82].

3. Агульны кантроль за дзейнасцю міравых пасрэднікаў і іх павятовых з'ездаў ажыццяўлялі губернскія па сялянскіх справах прысутнасці. У склад прысутнасці, акрамя вышэйшых саноўнікаў губерні, уваходзілі два члены з мясцовых дваран, якіх запрашалі па ўзгадненні з губернатарам і міністрам унутраных спраў, і два члены з мясцовых дваран-памешчыкаў, выбраных на сходзе губернскага і павятовых прадвадзіцелей дваранства. Пры разглядзе пытання аб выкупе сялянамі палявых угоддзяў на пасяджэнні прысутнасці запрашаўся ў якасці члена старшыня казённай палаты, а ў выпадку неабходнасці і неадменны член ад Міністэрства фінансаў.

У сувязі з пачаткам работы паверачных камісій у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губернях асабовы склад прысутнасцей павялічыўся за кошт члена ад Міністэрства фінансаў. З 1864 г. пры захаванні агульнай колькасці членаў ад вышэйшага саслоўя, прадстаўнікі па выбары ад мясцовага дваранства паступова замяняліся чыноўнікамі, прызначанымі ад урада. Запрашэнне лаяльных да ўлады чыноўнікаў з унутраных губерняў пярэчыла

самой ідэі прадстаўніцтва ад мясцовага вышэйшага саслоўя ў гэты орган кіравання.

Першай па часе перад губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі паўстала праблема адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання сялян у межах грамад і валасцей. Аднак арганізацыя сельскіх грамад і валасцей ставілася ў залежнасць ад палітычных абставін і задач цэнтральных і мясцовых улад, што не ішло на карысць сялянскаму самакіраванню.

Адной з галоўных задач, якія вырашалі губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, было пазямельнае ўладкаванне сельскага насельніцтва. Першым этапам было зацвярджэнне ўстаўных грамат – дакументаў, у якіх вызначаўся памер сялянскай зямлі і павіннасцей. Апошнім этапам у рэалізацыі рэформ 1861 г. і 1866 г. на губернскім узроўні з'яўлялася зацвярджэнне губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі выкупных і люстрацыйных актаў. У асноўным гэты працэс на тэрыторыі Беларусі быў завершаны ў пачатку 80-х гг. XIX ст.

Важнай істотнай асаблівасцю функцыяналу губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей у беларускіх губернях было размеркаванне кантрыбуцыйнага збору з даходаў маёнткаў дваран-католікаў і іх нерухомай маёмасці ў гарадах і мястэчках. Гэты збор даваў магчымасць павялічваць грашовае ўтрыманне чыноўнікаў, якія былі запрошаны ў край з іншых губерняў, але эканамічна падрываў гаспадарку памесных дваран. Акрамя таго, з 1869 г. прысутнасці павінны былі рэгуляваць правядзенне абавязковага размежавання сялянскіх надзелаў і памешчыцкіх зямель у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і інфляндскіх паветах Віцебскай губернях. Урад меў на мэце змяншэнне сацыяльнай напружанасці ў вёсцы, але недастатковасць фінансавання і недахоп землямераў не дазволілі прысутнасцям ў поўнай меры выканаць гэты абавязак [1; 3; 6; 7; 9; 12; 13; 19; 22; 23; 24; 25; 26; 28; 29; 32; 34; 36; 46; 51; 54; 55; 63; 64; 67; 71; 80].

4. На падставе «Местного положения…» для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і інфляндскіх паветаў Віцебскай губерняў прадугледжвалася стварэнне павятовых паверачных камісій для праверкі правільнасці складання памешчыкамі ўстаўных грамат і іх зацвярджэння міравымі пасрэднікамі. 21 лістапада 1862 г. былі зацверджаны спецыяльныя «Правила…», па якіх кожная з паверачных камісій складалася з члена ад урада (старшыня) па прызначэнні міністра ўнутраных спраў, міравога пасрэдніка таго ўчастка, у якім адбывалася праверка павіннасцей, і па адным прадстаўніку ад памеснага дваранства і сялян. Чыноўнікі ад урада ў час работы камісій адначасова ўваходзілі ў склад губернскай па сялянскіх справах прысутнасці.

У сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. указам ад 1 сакавіка 1863 г. у губернях Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і чатырох паветах Віцебскай адначасова з праверкай павіннасцей адбываўся і перавод сялян на абавязковы выкуп. З гэтага часу паверачныя камісіі складаліся з двух членаў ад урада і міравога пасрэдніка. Адзін член камісіі ад урада прызначаўся міністрам унутраных спраў, другі – міністрам фінансаў, старшынёй камісіі станавіўся чыноўнік ад МУС.

Эфектыўнасць работы камісій напрамую залежала ад кампетэнтнасці чыноўнікаў. Імкненне мясцовых улад як мага хутчэй закончыць работу па складанні і ўвядзенні выкупных актаў прыводзіла да шматлікіх парушэнняў. Гэта стала прычынай скаргаў і павелічэння сацыяльнай напружанасці ў беларускай вёсцы. Як правіла, у спрэчных сітуацыях камісіі вырашалі пытанні на карысць сялян, асабліва ў маёнтках памешчыкаў рымска-каталіцкага веравызнання, якіх урад імкнуўся пазбавіць эканамічнай вагі ў краі. Пры гэтым памеры выкупных плацяжоў паніжаліся на 20 % [1; 7; 12; 22; 28; 43; 72; 73; 80; 83].

5. 27 чэрвеня 1874 г. Аляксандр II зацвердзіў «Положение об изменениях в устройстве местных учреждений по крестьянским делам», якім ліквідаваўся інстытут міравых пасрэднікаў і ствараліся калегіяльныя павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці. Рэфармаванне было выклікана імкненнем скараціць фінансавыя выдаткі на названыя ўстновы, а таксама ліквідаваць аднаасобную ўладу міравога пасрэдніка ў вёсцы. Закон ад 27 чэрвеня 1874 г. на тэрыторыі Беларусі ўводзіўся з 1878 г. толькі ў трох губернях – Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай, а ў Віленскай і Гродзенскай захоўваўся інстытут міравых пасрэднікаў. Кіраўніцтва і кантроль за дзейнасцю павятовых прысутнасцей ажыццяўлялі губернскія па сялянскіх справах прысутнасці. Іх функцыянальныя абавязкі засталіся ў цэлым тымі ж, але былі і пэўныя змены. Губернская па сялянскіх справах прысутнасць па-ранейшаму ўзначальвалася губернатарам. Аднак, з-за адсутнасці ў беларускіх губернях земстваў фарміраванне складу губернскіх прысутнасцей тут мела свае асаблівасці. Па-першае, у склад прысутнасці не ўваходзіў прадстаўнік ад земства. Па-другое, губернскія і павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці часова былі ўкамплектаваны не адным, а двума неадменнымі членамі ў сувязі са значна большай колькасцю вырашаемых пазямельных спраў.

Фарміраванне кадравага складу павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей у трох беларускіх губернях адбывалася пераважна не з мясцовага памеснага дваранства, як таго патрабаваў закон 1874 г., а з чыноўнікаў

унутраных губерняў імперыі, таму што ўрад па-ранейшаму не давяраў прадстаўнікам вышэйшага саслоўя рымска-каталіцкага веравызнання.

Неадменны член павятовай прысутнасці павінен быў непасрэдна наглядаць за «крестьянским делом» у павеце. Аднак ён у параўнанні з міравым пасрэднікам не меў паўнамоцтваў аднаасобна вырашаць узнікаўшыя праблемы, ліквідаваць заўважаныя парушэнні, разбіраць скаргі і т. п. Усе праблемы па сялянскіх справах вырашаліся на пасяджэннях прысутнасцей, што зніжала эфектыўнасць іх работы і аўтарытэт у вачах сялянства.

Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці па-ранейшаму вырашалі пазямельныя спрэчкі як паміж памешчыкамі і сялянамі, так і паміж самімі сялянамі, справы па скаргах на неадпаведныя дзеянні і злоўжыванні службовых асоб сялянскага самакіравання, а таксама на рашэнні новаўтвораных павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей і інш. З выданнем законаў аб пазямельным уладкаванні іншых катэгорый сельскага насельніцтва (сельскіх вечных чыншавікоў, стараабрадцаў, адзінаверцаў і інш.) справаводства ў губернскіх і павятовых па сялянскіх справах прысутнасцях значна пашыралася, а кадравы склад у большасці з іх скарачаўся. Гэта з’явілася адной з прычын маруднага ходу рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў [1; 3; 7; 12; 26; 34; 64; 71].

6. Адной з асаблівасцей сістэмы мясцовага дзяржаўнага кіравання ў Беларусі з’яўлялася наяўнасць павятовых па чыншавых справах прысутнасцей. Ва ўнутраных губернях імперыі не існавала такой сацыяльнай групы сельскага насельніцтва, як сельскія вечныя чыншавікі. Таму ў заканадаўстве 1861 г. аб іх пазямельным уладкаванні нават не ўпаміналася. Пры гэтым паступова абвастраліся адносіны паміж імі і вотчыннікамі, на землях якіх яны жылі. Для вырашэння гэтай праблемы ў 1886 г. быў прыняты закон аб пазямельным уладкаванні чыншавікоў, якім неабходна было дакументальна даказаць сваё права на выкуп зямлі з фінансавай дапамогай урада. Разглядам такіх спраў займаліся спецыяльна створаныя павятовыя па чыншавых справах прысутнасці. У пераважнай большасці спрэчных выпадкаў яны вырашалі справы на карысць землеўладальнікаў, з якімі ўрад паступова наладжваў партнёрскія адносіны. Тым самым былыя саюзнікі па апазіцыі да самадзяржаўя (памешчыкі-католікі і чыншавая шляхта) былі супрацьпастаўлены адзін аднаму. Акрамя таго, недакладнасць заканадаўства і складанасць працэдуры доказу правоў на арэнду зямлі з’явіліся прычынай таго, што пазямельнае ўладкаванне чыншавікоў да канца існавання імперыі не было завершана [1; 26; 29; 32; 46; 64].

7. У пачатку 80-х гг. XIX ст. сістэма мясцовых устаноў, створаная паводле закону 1874 г., была прызнана ўрадам недасканалай. Таму ў 1889 г. адбылося чарговае яе рэфармаванне. Замест губернскіх па сялянскіх справах

прысутнасцей ствараліся губернскія прысутнасці, а павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці замянілі земскія ўчастковыя начальнікі і іх павятовыя з'езды. Аднак на тэрыторыі Заходняга краю, у тым ліку Беларусі, у гэты час «Положение о земских участковых начальниках» ад 12 ліпеня 1889 г. не было ўведзена. Асноўнай прычынай адтэрміноўкі была недастатковая колькасць мясцовых дваран-землеўладальнікаў праваслаўнага веравызнання для замяшчэння пасад земскіх начальнікаў. Пры гэтым у 1878–1903 гг. на тэрыторыі Беларусі мясцовыя па сялянскіх справах установы функцыянавалі на падставе розных заканадаўчых актаў, хаця і імкнуліся рэалізоўваць урадавую палітыку. Новае заканадаўства ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях было ўведзена ў 1901 г., а ў Віленскай і Гродзенскай – напрыканцы 1903 г.

Стварэнне інстытута земскіх начальнікаў было неапраўданым з пункту гледжання новых запатрабаванняў часу. Земскія начальнікі ў значнай ступені дубліравалі функцыянальныя абавязкі сваіх папярэднікаў – міравых пасрэднікаў. Разам з тым, інстытут міравых пасрэднікаў з'яўляўся дзейсным практычным механізмам рэалізацыі рэформы 1861 г. Пры гэтым ён практычна быў незалежным ад мясцовых органаў улады (генерал-губернатараў, губернатараў) і дзейнічаў у рамках прадстаўленых адміністрацыйных і судовых паўнамоцтваў. Кадравы ж склад земскіх начальнікаў фарміраваўся Міністэрствам унутраных спраў і быў залежным ад яго чыноўнікаў. Земскі начальнік станавіўся не толькі адміністратарам у дачыненні да ўсяго насельніцтва свайго ўчастка, але і выконваў абавязкі міравога суддзі. На практыцы рэалізаваць гэтыя функцыі адной асобе было немагчыма. Асабліва гэта праявілася падчас правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы. У сувязі з гэтым у 1912 г. было вырашана аднавіць міравы суд у адпаведнасці з судовымі статутамі 1864 г., а за земскімі начальнікамі пакінуць толькі адміністрацыйныя абавязкі.

Шматлікія нараканні з боку мясцовых улад і скаргі насельніцтва на дзейнасць земскіх участковых начальнікаў, а таксама адмена дваранскай прывілеі на замяшчэнне названай пасады прывялі да неабходнасці ўзмацнення кантролю над асабовым складам гэтых чыноўнікаў. Усувязі з гэтым Міністэрства ўнутраных спраў увяло ў губернскіх прысутнасцях абавязковыя экзамены для асоб, якія жадалі заняць пасаду земскага начальніка. Акрамя гэтага, Міністэрствам ўнутраных спраў з 1908 г. уводзіліся абавязковыя праверкі (рэвізіі) дзейнасці земскіх начальнікаў, якія давалі магчымасць не толькі кантраляваць, але і карэкціраваць работу гэтых чыноўнікаў, якія былі ўключаны ў агульную сістэму мясцовых органаў кіравання па рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы.

Павятовыя з’езды земскіх начальнікаў былі апеляцыйнай інстанцыяй на рашэнні земскіх начальнікаў. Яны складаліся з дзвюх частак – адміністрацыйнай і судовай прысутнасцей. Па адміністрацыйных справах павятовыя з’езды выконвалі ўсе абавязкі, якія раней ускладаліся на з’езды міравых пасрэднікаў з пэўнымі зменамі і дапаўненнямі. У сувязі з адсутнасцю дваранскіх выбараў на тэрыторыі Беларусі старшынямі павятовых з’ездаў з’яўляліся прадвадзіцелі дваранства рускага паходжання, зацверджаныя імператарам па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў.

З цягам часу і выданнем новых аграрных заканадаўчых актаў кампетэнцыя павятовых з’ездаў пашыралася. Ім былі перададзены паўнамоцтвы павятовых па чыншавых справах прысутнасцей. Гэта з’яўлялася важнай асаблівасцю дзейнасці павятовых з’ездаў земскіх начальнікаў на тэрыторыі Беларусі. Складанасць такіх спраў і недастатковае фінансаванне канцылярый з’ездаў прыводзілі да зацягвання вырашэння дадзеных пытанняў [1; 2; 3; 4; 6; 7; 8; 9; 12; 14; 21; 23; 28; 29; 30; 31; 32; 39; 40; 44; 46; 55; 63; 70; 71; 74; 77; 79; 84].

8. Перайменаванне губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей у губернскія прысутнасці не з’яўлялася фармальным актам. Справа ў тым, што да канца XIX ст. значна ўскладніліся сацыяльна-эканамічныя адносіны ў сельскай мясцовасці. Калі пасля рэформы 1861 г. асноўнымі суб’ектамі гэтых адносін з’яўляліся памешчык – селянін, то з развіццём капіталізму ў вёсцы скlаліся новыя катэгорыі насельніцтва – прамысловая і гандлёвая буржуазія, рабочы клас, што значна ўскладняла сацыяльную структуру ў правінцыі. Спатрэбіўся новы кіруючы орган, на які ўскладвалася задача па вырашэнні праблем больш рознабаковага маштабу. Ім сталі губернскія прысутнасці. Яны адыгрывалі значную ролю ў рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў. Гэтым органам надаваліся шырокія паўнамоцтвы па кантролю і каардынацыі дзейнасці земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў. Непасрэдныя выканаўчыя функцыі ў прысутнасцях ускладваліся на аднаго-двух неадменных членаў, якія за сваю работу атрымлівалі дзяржаўнае жалаванне. Разам з тым, своечасовае выкананне функцыянальных абавязкаў неадменнымі членамі было праблематычным, што зацягвала вырашэнне некаторых спраў на няпэўны тэрмін [1; 3; 4; 6; 7; 8; 9; 12; 13; 19; 20; 23; 28; 29; 30; 31; 32; 36; 37; 39; 40; 44; 46; 52; 54; 55; 56; 59; 60; 70; 71; 74; 77; 79; 84].

9. Сталыпінская рэформа стала важным крокам на шляху мадэрнізацыі сацыяльна-эканамічных адносін у аграрным сектары эканомікі. Для яе правядзення ствараліся новыя спецыяльныя органы цэнтральнага (ГУЗіЗ) і мясцовага (павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі) кіравання. Першапачаткова меркавалася, што камісіі пераважна будуць спрыяць продажу

сялянам участкаў дзяржаўнай і банкаўскай зямлі. Паступова іх функцыі пашыраліся, удакладнялася і заканадаўства, накіраванае на стварэнне ў вёсцы слоя заможных аднаасобных сялянскіх гаспадарак як апоры імператарскай улады.

З выданнем законаў ад 14 чэрвеня 1910 г. і 29 мая 1911 г. сфера дзейнасці камісій значна пашырылася. Землеўладкаванне выйшла за межы сялянскіх надзелаў, у яго працэс уключаліся землі розных форм уласнасці. Камісіям былі нададзены судовыя паўнамоцтвы ў вырашэнні спрэчных зямельных пытанняў. Гэта паскорыла працэс развярстання зямель і стварэння хутарскіх і адрубных гаспадарак. Хутаранам аказвалася агратэхнічная дапамога праз функцыянаванне пракатных станцый, узорных гаспадарак і палёў, распаўсюджванне перадавога вопыту ў земляробстве і жывёлагадоўлі.

Паспяховасць дзейнасці землеўладкавальных камісій напрамую залежала ад узаемадзеяння з іншымі органамі мясцовага кіравання – губернскімі прысутнасцямі, земскімі начальнікамі і іх павятовымі з’ездамі.

З адкрыццём землеўладкавальных камісій на земскіх начальнікаў былі ўскладзены дадатковыя функцыі. Яны павінны былі тлумачыць сялянам сэнс аграрных заканадаўчых актаў, заахвочваць сялян у набыцці зямлі праз аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка, засведчваць прысуды мірскіх сходаў аб выдзеле зямлі і ўгоддзяў у асабістую ўласнасць выхадцам з абшчыны, удзельнічаць у рабоце павятовых землеўладкавальных камісій па справах свайго ўчастка, выконваць даручэнні неадменных членаў камісій па падрыхтоўцы праектаў землеўладкавання і, у некаторых выпадках, рэалізоўваць іх у якасці землеўладкавальніка. Акрамя гэтага, на земскіх начальнікаў ускладваўся абавязак па выдачы хадачаскіх пасведчанняў і іншых дакументаў перасяленцам у Сібір і на Далёкі Ўсход.

Павятовыя з’езды земскіх начальнікаў разбіралі скаргі сялян на рашэнні сельскіх сходаў і земскіх начальнікаў па пытаннях выхаду вяскоўцаў з грамады і замацавання за імі надзельных зямель у асабістую ўласнасць. Канчатковае заключэнне па іх ускладалася на губернскую прысутнасць. З мэтай недапушчэння парушэнняў прысутнасці пастаянна праводзілі рэвізіі работы земскіх начальнікаў па замацаванні зямлі сялянамі ў асабістую ўласнасць, выдавалі інструкцыі па правільным афармленні прысудаў сельскай грамады і іх засведчванні з боку земскага начальніка. Пры гэтым неабходна адначыць, што да канца 1911 г. у складзе Віленскай і Гродзенскай прысутнасцей функцыі губернскіх землеўладкавальных камісій выконвалі спецыяльныя аддзяленні па справах землеўладкавання.

Вынікам сумеснай работы губернскіх і павятовых землеўладкавальных камісій, земскіх начальнікаў, іх павятовых з’ездаў і губернскіх прысутнасцей з’явілася тое, што на працягу 1906–1916 гг. у беларускіх губернях на

надзельных землях было створана 113,8 тыс. хутарскіх і адрубных гаспадарак на плошчы 1147,2 тыс. дзес. Акрамя гэтага, на купленай у Сялянскага банка зямлі ўзнікла яшчэ 13,5 тыс. гаспадарак плошчай 228,7 тыс. дзес. На прададзенай сялянам казённай зямлі (5,4 тыс. дзес.) былі створаны 813 хутарскіх і адрубных гаспадарак. У выніку рэалізацыі рэформы ў 5 беларускіх губернях прыватная сялянская зямельная ўласнасць павялічылася з 43,6 да 54,1% ад яе агульнай колькасці [1; 7; 12; 13; 33; 35; 45; 53; 54; 68; 74; 75; 76; 77; 78; 79; 84].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняючых навуковых работ, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў, спецкурсаў па гісторыі Беларусі і і Расіі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

Практычнае значэнне навукова-абгрунтаваных высноў дысертацыі заключаецца і ў наданні новага ракурсу даследаванням па аграрнай гісторыі Беларусі і Расіі на аснове выяўлення сутнасці ўрадавай палітыкі, эфектыўнасці дзейнасці інстытутаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі і ступені ўплыву на мадэрнізацыйныя працэсы ў сацыяльна-эканамічнай сферы.

Матэрыялы даследавання могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання, гістарычнымі і этнаграфічнымі музеямі Рэспублікі Беларусь.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА


*Манаграфія*

1. Талмачова, С. А. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.) : манаграфія / С. А. Талмачова. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2019. – 344 с.

*Навуковыя выданні*

2. Талмачова, С. А. Земская рэформа / С. А.Талмачова // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 1 / А. А.Каваленя [і інш.] ; рэдкал. А. А.Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 125–138.

3. Талмачова, С. А. Сялянскае самакіраванне / С.А. Талмачова // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 1 / А.А.Каваленя [і інш.] ; рэдкал. А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 112–125.

4. Талмачова, С. А. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел / А. П. Жытко, С. А. Талмачова // Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі. 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – Гл. 3. – С. 75–86.

5. Талмачова, С. А. Гістарыяграфія і крыніцы / А. П. Жытко, С. А. Талмачова, А. А. Падарожняя // Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі. 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – Гл. 1. – С. 10–22, 61–64.

6. Талмачова, С. А. Саслоўнае і бессаслоўнае самакіраванне / А. П. Жытко, С. А. Талмачова, Т. В. Грышкевіч // Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі. 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – Гл. 6. – С. 153–185.

